Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

№ 88 (3196) Пятніца, 19 Красавіка 1929 г.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XII

РАДЫЯ у гадзіну ночы:

ТАШКЕНТ, 17. 18 красавіка банда, арганізаваная на аўганскай тэрыторыі, перайшла савецка-аўганскую граніцу і заняла горад Калай-Хумба (Паджыкістан). 15 красавіка другая банда зрабіла налёт з Аўганістану ў раёне Ванч (на Паміры) і пасьля рабунку і гвалтаў адышла на аўганскую тэрыторыю.
Прымаюцца меры для зьлікідаваньня гэтых банд.

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Сацыялістычны дагавор заводаў „Чырвоны Мэталісты" і „Камінтэрн"

Наркамзем пачынае гэнэральную праверку падрыхтаванасьці да сяўбы

На Мазыршчыне органі зуецца вялікі калгас

ТРЭЦІ АКРУГОЗЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ МЕНШЧЫНЫ

СПРАВАЗДАЧА ЎРАДУ БССР

З дакладу старшыні ЦВК БССР тав. А. Г. ЧАРВЯКОВА

На ранішнім пасяджэньні 18 красавіка тав. **Чарвякоў** выступіў з дакладам на тэму: «Асноўныя вынікі і далейшыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі».

Мы жывем у пэрыяд пляновага сацыялістычнага будаўніцтва

— Восьмы Зьезд Саветаў БССР, кажа дакладчык,—заканчвае фармаваньне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, як часткі Савецкага Саюзу. На гэтым зьезьдзе адбылося канчатковае афармленьне аб'яднаньня тэрыторыі з большасьцю беларускага насельніцтва, шляхам уключэньня ў склад БССР Гомельшчыны. На гэтым зьезьдзе была зацьверджана канстытуцыя БССР са зьменамі, якія выцякаюць з факту ўтварэньня СССР, уваходу Беларусі ў СССР і прыняцьця Саюзнай Канстытуцыі. Дзякуючы гэтаму было аформлена дзяржаўна-прававое становішча БССР у складзе СССР. Таксама былі разгледжаны і зацьверджаны асновы пляну гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР. Усё гэта надало VIII-му Зьезду Саветаў БССР характар рубяжу, якім заканчваецца пэрыяд рэдняя-падрыхтоўчы пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва Беларусі і пачынаецца новы пэрыяд пляновага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ня гледзячы на тое, што ў часе працы VIII-га Зьезду адбыўся рад правакацыйных выступленьняў супроць СССР на Ўсходзе і Захадзе, Зьезд даў дырэктыву **рашуча праводзіць мірную палітыку, высьвятляючы і выкрываючы ўсе правакацыйныя захады буржуазіі і капіталістых.**

Наша палітыка—палітыка міру

Закрануўшы міжнароднае становішча Савецкага Саюзу, дакладчык спыніўся на тым, што наша палітыка была і ёсьць палітыкай міру, палітыкай імкненьня да мірнага будаўніцтва. Савецкі ўрад вёў напружаную працу па захаваньні міру. У той жа самы час ў капіталістычным сьвеце канкуранцыя паміж паасобнымі дзяржавамі, ня толькі ня зьменшылася, але, наадварот, яшчэ больш павялічылася. Ідзе шалёнае ўзбраеньне капіталістычных дзяржаў.

Капіталістычныя дзяржавы яшчэ не пакінулі думкі аб узброеным нападзе на Савецкі Саюз. Большая ці меншая напружанасьць варожых адносін да Савецкага Саюзу тлумачыцца цэлым рад момантаў: нашым унутраным становішчам, эканамічным і палітычным становішчам капіталістычных дзяржаў, узаемаадносінамі паміж заходнімі дзяржавамі.

Узмацняць абароназдольнасьць краіны

Далей тав. Чарвякоў у сваім дакладзе адзначае, што, пяглядзячы на ўсе разважаньні і нарады капіталістычных дзяржаў аб устанаўленьні міру, нагроза вайны не адпадае. Няма падстаў дасля дэмабілізацыйных настрояў. Мы не павінны аддавацца мірным, пацыфіцкім настроям. Яны зьяўляюцца шкодным, бо небясьпека вайны не паменшылася. Капіталістычны сьвет імкнецца выкарыстаць усе магчымасьці, каб зьнішчыць краіну Саветаў. Да тэй пары, пакуль існуе капіталістычны сьвет, мы прымушаны ўзмацняць абароназдольнасьць краіны, пяглядзячы на тое, што мы імкнемся да міру.

Мы і ў далейшым будзем працягваць палітыку міру, унікаючы ўсіляких міжнародных ускладненьняў, выкрываючы ўсе хітрыкі капіталістычных дзяржаў. Мы і надалей будзем умацоўваць сувязь Савецкага Саюзу з працоўнымі ўсяго сьвету. Але ў кожную хвіліну мы павінны быць гатовымі да вайны. Мы павінны рыхтавацца да таго, каб у момант нападу мець у нашай краіне ўзброены лягэр усіх працоўных мас, каб даць належны адпор усім тым, хто адважыцца напасьці на краіну Саветаў.

Далей дакладчык перайшоў да высьвятленьня вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Расьце наша гаспадарка і культура

Шмат сіл і сродкаў кінута намі на разьвіцьцё прамысловасьці і культуры нашае краіны. Гэтае разьвіцьцё ідзе шпаркім тэмпам. Значная частка намечаных задач ужо вырашана. Перад намі—галоўныя паказальнікі гаспадарча-культурнага росту Беларусі за мінулы год:

Рост фондаў сельскай гаспадаркі у параўнаньні з мінулым годам характарызуецца наступнымі лічбамі: у 26-27 г.—15 проц., у 27-28 г.—27,6 проц. Валовая продукцыя прамысловасьці ў 25-26 г. дасягала 104,6 проц., у 26-27 г.—120,4 проц., 27-28 г.—129,3 проц. Накапленьне фондаў электрафікацыі у 26-27 годзе раўнялася 10,2 проц., у 27-28 г.—66,9 проц.; жыльлёвага фонду: у 26-27 г.—1,3 проц., 27-28 г.—5,5 проц. Хоць павялічэньне жыльлёвага фонду праходзіць і павольна, але ўсе-ж такі мы маем пэўны рост яго.

Адначасна растуць выдаткі на сацыяльна-культурныя патрэбы: на мэдыцыну, асьвету, сацыяльнае забесьпячэньне. Паляпшаецца матар'яльнае становішча працоўных мас. У параўнаньні з 25-26 г. пакупная здольнасьць насельніцтва ў 28-29 г. павялічылася: па горадзе—на 34,9 проц., у вёсцы—на 28,3 проц.

Адзіны шлях разьвіцьця—індустрыялізацыя краіны і сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі

Спыніўшыся на перажываемых зараз гаспадарчых цяжкасьцях, тав. **Чарвякоў** адзначаў, што нашы ворагі імкнуцца выкарыстаць нашы часовыя замінкі на гаспадарчым фронце. Недахоп с.-гас. прадуктаў тлумачыцца ростам запатрабаваньня на прадукты з боку народнай гаспадаркі і насельніцтва. Пры невыстарчальным росьце валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі становішча пагоршылася з прычыны недароду на Украіне і Паўночным Каўказе, і недабору каля 200 міл. хлеба.

Каб зьнішчыць гэтыя недахопы, ў далейшым нам трэба ўзмацніць тэмп разьвіцьця сельскае гаспадаркі і ўзьняцьця ўраджайнасьці.

Па якім шляху павінна разгортвацца далейшае разьвіцьцё сельскае гаспадаркі?

— Хаця мы і робім стаўку,—кажа дакладчык,—на бедняка, але мы жадаем зьнішчыць гэту беднасьць. У БССР само сялянства ўжо пачынае разумець, што **шляхам індывідуальнага вядзеньня гаспадаркі палепшыць сваё становішча нельга.** Мы ведаем, што калектыўная, буйная форма вядзеньня сельскае гаспадаркі зьяўляецца найбольш выгаднай формай. Буйная гаспадарка гэта тое, да чаго мы імкнемся. У некаторых раёнах БССР сялянства само просіць аб арганізацыі на іх землях саўгасаў. Такой-жа высокай формай вядзеньня сельскай гаспадаркі зьяўляюцца і калгасы, найбольш прыстасаваныя да сялянскіх умоў; іх мы павінны цалкам падтрымліваць.

Іншы шлях вядзе да ўзмацненьня прыватных тэндэнцый, карысных толькі кулацкім гаспадаркам і супярэчыць інтарэсам бядняцкіх і сярэдняцкіх мас сялянства; яго мы павінны рашуча адхіліць. Гаворачы аб далейшых задачах разьвіцьця нашае прамысловасьці, дакладчык указвае што нам трэба будаваць буйную прамысловасьць, каб забясьпечыць нас усімі мацынамі, патрэбнымі для вытворчасьці, каб не залежаць ад капіталістычных краін. У ближэйшае 5-годзьдзе ў БССР паводле пляну мяркуецца шырока разгарнуць прамысловае будаўніцтва. Мяркуецца ўкласьці ў разныя прадпрыемствы 260 міл. рублёў і ўцягнуць у прамысловасьць 122 тыс. рабочых.

Важнае месца павінна заняць культурнае будаўніцтва, паводле 5-цігодкі, у БССР мяркуецца ўвесьці ўсеагульнае навучаньне. Нам трэба ўзмацніць тэхнічную асьвету, падрыхтаваць патрэбныя кадры інжэнэраў, тэхнікаў і высока-кваліфікаваных рабочых.

Дакладчык закранае пытаньне аб **палепшаньні нашага савецкага апарату,** камуністычная партыя і савецкая ўлада абвясьцілі жорсткую барацьбу бядзушнаму бюракратызму, які яшчэ знаходзіць часта сабе месца ў нашых савецкіх установах. Мы павінны выкінуць з тэатра апарату ўвесь шкодны элемэнт, які затрымлівае тэмп нашага будаўніцтва.

— На ўсе выступленьні нашых ворагаў,—кажа тав. **Чарвякоў** у канцы свайго дакладу,—мы павінны адказаць дружным згуртаваньнем працоўных мас вакол камуністычнае партыі і савецкае ўлады. Нам трэба яшчэ больш узмацніць саюз рабочых з бяднейшым і сярэдняцкім сялянствам. Нам трэба прыцягнуць да савецкага будаўніцтва, да будаўніцтва сацыялізму сумленных, працаздольных і адданых людзей, натхнёных энтузіязмам рэвалюцыі, натхнёных энтузіязмам творчай працы.

Сяляне вітаюць зьезд

Зьезд вітаюць сяляне Бараўскага сельсавету, Заслаўскага раёну, якія даставілі на чырвоных абозах хлеб у Менск.

Селяшін **Лісьнеўскі** і сялянка **Чарнавусік** жадаюць зьезду плённай работы і хутчэйшага вырашэньня **пытаньняў калектывізацыі і разьвіцьця сельскае гаспадаркі.**

— Мы жадаем,—кажа сялянка Чарнавусік,— каб на нашых палёх цягнулі плугі ня худыя коні, а моцны сталёвы трактар.

Тав. **Чарвякоў** у сваім адказе сялянам сказаў:

— Ваш чырвоны абоз,—кажа т. Чарвякоў, зьяўляецца зараз лепшым падарункам, які можа зрабіць сялянства савецкай уладзе. Значэньне гэтага абозу ня толькі ў тым, што ён узмацняе рэсурсы дзяржавы, ён даказвае, што горка памыляюцца нашы ворагі, якія ня вераць у саюз рабочых і сялян. Узмацненьне сувязі рабочых і сялян—гэта шлях да перамогі і палепшаньня нашага жыцьця.

На жэнэўскай гаварыльні

„Разыгрываецца найвялікшая камэдыя ў сьвеце"

Імпэрыялістыя імкнуцца праваліць савецкі праект разбраеньня

Выступленьне прадстаўнікоў савецкай дэлегацыі

ТРЫ ПРЫНЦЫПЫ САВЕЦКАГА ПРАЕКТУ

ЖЭНЭВА, 17. Камісія па разбраеньні па просьбе Тэвфык Рушды-Бэя ўключыла асобным пунктам у парадак дня сасіі турэцкую прапанову аб устанаўленьні прынцыпу роўнага абмежаваньня ўзбраеньняў.

Пэрсыдзкі дэлегат Хусэйн Хан, які ўпяршыню бярэ ўдзел ў камісіі, выступіў з заявай аб патрэбнасьці дазволіць слаба ўзброеным краінам разгарнуць ваенныя сілы ў часе вайны і прывесьці ўзбраеньні ў адпаведнасьць з патрэбамі абароны.

ПРАМОВА САВЕЦКАГА ВАЕННАГА ЭКСПЭРТА ЛАНГАВОГА

Потым выступіў з прамовай член савецкай дэлегацыі, ваенны экспэрт Лангавы, які, спасылаючыся на агульную характарыстыку праекту і яго асноўных прынцыпаў, даную Літвінавым, ахарактарызаваў паасобныя часткі праекту.

Лангавы падкрэсьліў, што бясспрэчнай перавагаю савецкага праекту ў параўнаньні з праектам камісіі зьяўляецца **яго канкрэтнасьць і яснасьць прапаноў адносна мэтаду ў і лічбаў узбраеньня. Скарачаць, а не абмяжоўваць—такі асноўны прынцып савецкага праекту.** Прапарцыянальна зьмяншаючы ўсе віды ўзбраеньняў кожнае дзяржавы, савецкі праект дапускае параўнаўча меншае скарачэньне ўзбраеньняў малых краін, якія не прадстаўляюць значнай небясьпекі для міру. Скарачэньне ўзбраеньняў перш за ўсё датычыцца вялікіх краін, якія найбольш прасякнуты мілітарызмам.

Угрунтаваўшы імкненьне савецкага праекту зьнішчыць пераважна наступацельныя ўзбраеньні, пакідаючы абарончыя, Лангавы падкрэсьліў з усёй катэгарычнасьцю, што ўсякае мерапрыемства, здольнае хаця-бы ў самай малой ступені расьсекаць напружаную атмасфэру пасьля ваенных гадоў, затрымаць пачатак новай жудаснай вайны, СССР будзе біцаць, як вялізнае дасягненьне і рэальную перамогу грамадзкае думкі самых шырокіх народных мас. Разглядаючы далей кожны артыкул савецкага праекту ў паасобку, Лангавы адзначыў тую сыстэму прагрэсыўнага скарачэньня ўзбраеньняў шляхам падзелу ўсіх дзяржаў на тры групы, якая ўносіцца савецкім праектам.

Далей Лангавы указаў, што праект скарачае як агульную налічанасьць сухаземных узброеных сіл, так і паасобныя іх віды: войскі мэтраполій, войскі ў калёніях, лік вайсковых адзінак, налічанасьць камандзнага складу і г. д. Прапанову захаваць існуючыя тыпы ваенных матар'ялаў, **праект ставіць граніцы ганебнай для чалавецтва ліхаманцы пераўзбраеньня і пагоні за новымі ваеннымі вынаходніцтвамі, практычны сэнс якіх заключаецца ў рэкордная вытворчасьці трупаў.** Праект прапануе таксама зьнішчыць найбольш агрэсыўны выгляд ваенных суднаў, а імена авіяносцы, паступова замяняючы лінейныя караблі суднамі разьмерам у 10.000 тон. Гэтая норма, устаноўленая Вэрсальскім дагаворам для Нямеччыны, відавочна прызнана дзяржавамі-пераможцамі выстарчальнай для абароны і абмяжоўвае агрэсыўнасьць марскіх сродкаў барацьбы. Абмяжоўваючы калібр марской артылерыі, тапаж ваенных суднаў, адмаўляючыся ад самалётаў на ваенных суднах і г. д. праект імкнецца паслабіць разбуральнае дзеяньне марскіх сродкаў вайны, зьменшыць выдаткі на іх. У мэтах паслабленьня нагрозы паветранага флёту для мірнага насельніцтва праект прапануе адмовіцца ад наступальных паветраных сіл і ў першую чаргу ад бамбардыровачнай авіяцыі, прапануе разбраеньне дырыжабляй, абмежаваньне магутнасьці самалётаў, адмену авіяцыйных бомб і іншых зьнішчаючых сродкаў.

У заключэньне Лангавы заявіў, што савецкая дэлегацыя гатова даць любыя далейшыя высьвятленьні праекту.

***

У спрэчках першым выступіў Сато ад Японіі, Бэрнсдорф—ад Нямеччыны, Масоільлі ад Францыі. Сато заявіў, што ён гатоў пасьведчаць прапанове Літвінава абгаворваць асноўныя прынцыпы савецкага праекту, бо прызнае значэньне яго, акрамя таго «выконвае гэтым абавязак ветлівасьці ў адносінах да прадстаўніка прыяцельскай дзяржавы». Заканчваючы сваю прамову, Сато заклікаў Літвінава «зрабіць яшчэ крок насустрач, прадставіўшы ўстанаўленьне лічбаў не камісіі, а канфэрэнцыі па разбраеньні».

Выступіўшы пасьля Сато Бэрнсдорф выказаў надзею, што савецкія прапановы, у зьмесьце якіх ёсьць новая ідэя, ажывяць і пасунуць наперад работу падрыхтоўчай камісіі, якой пагражае адхіленьне ад яе першапачатковага заданьня—скарачэньня ўзбраеньняў у бок вельмі мізэрных задач». Савецкі праект азначае крок да ўраўнаньня ўзбраеньняў, забясьпечвае інтарэсы грамадзянскага насельніцтва, высоўваючы, напрыклад, забарону скіданьня бомб самалётамі, што прапануецца таксама і нямецкім мэмарандумам. (ТАСС).

ЖЭНЭВА, 17. Сёньняшняе вячэрняе пасяджэньне падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі па разбраеньні пачынаецца ў абстаноўцы ўсеагульнага замяшацельства. Ніхто з дэлегатаў не адгукаецца на запытаньне старшыні, хто жадае выказацца адносна савецкага праекту скарачэньня ўзбраеньняў.

Тады слова бярэ кіраўнік савецкай дэлегацыі Літвінаў, які падкрэсьлівае, што ў спрэчках ня было прыведзена ніякіх аргумэнтаў, каб адхіліць савецкі праект, ці спыніць пачатае вытрэбленьне гэтага праекту. Сутнасьць супярэчнасьцяй японскага дэлегата Сато,—сказаў Літвінаў,—зводзіцца да таго, што пры разбраеньні трэба выходзіць з патрэб бясапаснасьці кожнай паасобнай дзяржавы. Калі давесьці да лёгічнага канца думку Сато аб тым, што кожная дзяржава сама вызначае вехі сваёй бясапаснасьці і разьмер сваіх узбраеньняў, дык гэта азначала-б, што трэба пакінуць у моды цяперашняе становішча.

Выходзячы з гэтага нельга прызнаць магчымым нават абмежаваньне ўзбраеньняў, бо калі якая-небудзь дзяржава вырашыць, што абарона яе бясапаснасьці патрабуе павялічэньня ўзбраеньня, дык зьяўляючыся сама судзьдзяй у гэтай справе, яна не павінна дапушчаць ніякага прыватнага ўмяшальніцтва ў свае рашэньні. Калі прытрымлівацца гэтага, дык камісія німінуча прыдзе да адмовы ад усякага разбраеньня. Усеагульнае скарачэньне ўзбраеньняў паводле аднолькавых адзнак і ў аднолькавай прапорцыі ні ў якой меры не парушыць бясапаснасьці якой-небудзь дзяржавы і ня зьменіць існуючых суадносін сіл.

Я дапушчаю недасканаласьць савецкага праекту і магчымасьць яго палепшаньня. Таму мы будзем вітаць усялякія заўвагі і прапановы. Канкрэтна маецца толькі адна савецкая прапанова, адхіліўшы яе, вы фактычна застанецеся на тым-жа месцы, дзе вы былі 2 гады таму назад. Спрэчка ідзе аб тым, **ці павінна камісія займацца падрыхтоўнай да канфэрэнцыі па разбраеньні, ці бязьдзейнічаць далей.** Савецкі праект быў унесены 13 месяцаў таму назад, падрыхтоўчая камісія рэкамандавала ўрадам вывучыць яго і праект бяспрэчна вывучаны. Камісія павінна перш за ўсё выказацца аб асноўных прынцыпах савецкае прапановы, а іменна адносна згоды: 1) **аб значным скарачэньні існуючых узбраеньняў,** 2) **аб правядзеньні скарачэньня па прынцыпу прапарцыянальнасьці, дапушчаючы некаторыя адхіленьні для дробных краін і** 3) **аб адначасовым устанаўленьні наэфіцыэнту прапарцыянальнага скарачэньня.** Калі камісія мае намер эрабіць крок наперад, дык яна не павінна ўхіляцца ад яснага і пядвусэнснага адказу на гэтае пытаньне».

Лёўдон імкнецца пакончыць з ненавісным савецкім праектам

Старшыня нямецкае дэлегацыі Бэрнсдорф заяўляе, што ён лічыць немагчымым адказаць на пастаўлянае Лёўдонам на галасаваньне пытаньне, простым «так» ці «не», бо савецкі праект мае ў сваім зьмесьце надзвычайна карысныя і цікавыя падзелы. Бэрнсдорф лічыць немагчымым адхіліць цалкам савецкі праект, паасобныя часткі якога зьяўляюцца дасканалымі.

Лёўдон зноў спрабуе паставіць сфармуляванае ім пытаньне на галасаваньне. Сэнс заблытанай абстаноўкі, якая выклікана, з аднаго боку—спробай Лёўдона пакончыць з савецкім праектам шляхам галасаваньня высунутай ім агульнай формулы, а з другога—выступленьнямі Бэрнсдорфа і Тэвфіка, **высьвятляецца прамоваю Літвінава, за якой дэлегаты, прадстаўнікі друку і шматлікая публіка сачаць з непружанай увагай.** Тав. Літвінаў указвае, што турэцкая дэлегацыя робіць памылку, мяркуючы, што савецкі праект канкуруе з турэцкімі прапановамі. Турэцкі прадстаўлены не праект канвэнцыі, а тэхнічная, не ўдакладненая прынцыповая прапанова. Літвінаў прапануе па чарзе прагаласаваць з прынцыпы савецкага праекту.

Камісія прымае прапанову Лёўдона адкласьці на заўтрашні дзень галасаваньне або формулы Лёўдона, або трох прынцыпаў Літвінава, бо паводле слоў Лёўдона «інакш мы ня будзем ведаць, за што галасуем».

Правял пляноў аб ізаляцыі савецкай дэлегацыі

ЖЭНЭВА, 17. Сёньняшнія выступленьні Літвінава, які мог на мэце ясна паставіць перад камісіяй прынцыповыя асновы савецкага праекту, сканцэнтраваныя ў трох пытаньнях, зрабілі тут выключна моцнае ўражэньне і адназгодна прызнаюцца ўсімі адным з найбольш яскравых моментаў жэнэўскіх выступленьняў савецкай дэлегацыі на карысьць разбраеньня за апошнія два гады. Прадстаўнікі друку і публіка, якімі была перапоўнена заля і сярод якіх было ня мала дзеячоў буржуазных нацыфіскіх арганізацый, а таксама наглядальнікі з секцый 2-га Інтэрнацыяналу, з напружанай увагай сачылі за 3-я выступленьнямі Літвінава, у часе якіх ён імкнуўся ня даць натаніць і затуманіць прынцыповы сэнс савецкіх прапаноў у тыповай жэнэўскай працэдурнай блытаніне. Назат найбольш адкрытыя анты-савецкія элэмэнты мясцовых палітычных колаў прызнаюць, што савецкая дэлегацыя на працягу першых трох дзён канфэрэнцыі затрымала адну за другой тры перамогі над рэгістратурай камісіі па пытаньнях працэдуры. У пэўных колах камісіі моцна ўпалі надзеі на магчымасьць ізаляцыі савецкай дэлегацыі ад дэлегацый іншых краін, якія неадволены дзейнасьцю Лігі ў пытаньнях разбраеньня. У кожным разе, трэба канстатаваць, што ані працэдурныя манэўры—як згода Лёўдона на 2-ое чытаньне праекту канфэрэнцыі Лігі, якая раней лічылася немагчымай, ані чуткі, што распасьюджваюцца ў Жэнэве, аб зьліжэньні паміж ангельскім і амэрыканскім пунктам погляду ў пытаньні аб выраўнаньні марскіх разнагалосьсяў, ані жэнэўскія выступленьні лідэраў 2-га Інтэрнацыяналу, ані іншыя думкі не змаглі адцягнуць увагі ад ясна пастаўленых савецкай дэлегацыяй пытаньняў аб прынцыпах скарачэньня ўзбраеньняў.

Словы і спразы жэнэўскіх „міротворцаў"

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 17. «Джумурыэт» (орган народнай партыі) піша: **«У Жэнэве разыгрываецца найвялікшая ў сьвеце камэдыя пад назвай «Абмежаваньне ўзбраеньняў». Дыплёматы гавораць аб міры і аб гуманнасьці і адначасова точаць зброю. Ліхаманнавая падрыхтоўка вайны ў сучасны момант адзначаецца ад падрыхтоўкі да вайны ў 1914 годзе толькі тым, што тады рыхтаваліся адкрыта, цяпер-жа адначасова з ваеннымі фабрыкамі, працуюць фабрыкі хлусьні і двудушнасьці».** (ТАСС).

Савецкі праект загадзя засуджан на няўдачу

РЫМ, 18. Фашысцкі друк, адносячыся ў пэўнай меры спагадліва да крытыкі работ падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні савецкай дэлегацыяй, выступае аднак супроць савецкага праекту разбраеньня, спрабуючы яго дыскрэдытаваць.

Скарачаючы перадачу прамовы Літвінава да некалькіх выразаў, газэта «Дэль Пополо» піша, што Масква надта стараецца заваяваць добрыя адносіны з боку Вашынгтону ў надзеі, што ёй удасьцца дамагчыся прыцёку амэрыканскіх капіталаў. Таму цалкам зразумела, што Літвінаў пры кожным удобным выпадку хваліць пакт Кэлёга.

«Трыбуна», характарызуючы пазыцыі паасобных краін, піша, што сучасная сэсія падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні мае для Англіі значэньне толькі ў сувязі з надыходзячымі выбарамі. Газэта «Стамп» лічыць, што савецкая дэлегацыя, дабіўшыся абгаварэньня свайго праекту, атрымала бязумоўна посьпех. «Але,—дадае **газэта,—гэта ня змачыць, што маецца хоць маленькая надзея на прыняцьце Літвінаўскага праекту».**

Італьянска-Юга-Слаўскі канфлікт

ВЕНА, 17. Паміж Італіяй і Юга-Славіяй узьнік новы канфлікт. Повадам для яго паслужылі выкрыцьці «Джорнале дэ Італія», зьмешчаныя на аснове дакумэнту, які выходзіць, па словах газэты, у Югаслаўскага генштабу. Дакумэнт гэты, па словах газэты, сьведчыць аб ваенных падрыхтаваньнях Юга-Славіі.

Юга-слаўскі ўрад апублікаваў паведамленьне, дзе катэгарычна абвяргае гэтыя выкрыцьці. Юга-Слаўскі друк рэзка нападае на Італію і называе кампанію «Джорнале дэ Італія» манэўрам, які мае мэтай парашкодзіць згодзе Юга-Славіі з яе суседзямі і замаскаваць уласныя ўзбраеньні. Белградзкія газэты падкрэсьліваюць, што гэтая кампанія невыпадкова разгарнулася пасьля парады Чэмбэрлена і Мусаліні ў Флёрэнцыі і ўзьнікла якраз да пачатку сэсіі падрыхтоўчай камісіі канфэрэнцыі па разбраеньні. Газэта падазраває, што дакумэнт зьяўляецца фабрыкатам баўгарскага пасольніка ў Вене, які працуе па словах газэты, пад стварэньнем Вэнгэрска-Італьянска-Баўгарскага саюзу, накіраванага супроць Юга-Славіі.

У зьвязку з выкрыцьцямі, італьянскі пасланьнік Галі і дыплёматы іншых дзяржаў наведалі выконваючага абавязкі Юга-слаўскага міністра замежных спраў Куманудзі з мэтай атрыманьня інфармацыі. Куманудзі выказаў італьянскаму паслу Галлі зьдзіўленьне з прычыны італьянскіх выкрыцьцяў. Ён ахарактарызаваў гэтыя выкрыцьці, як наклёп з боку паасобных італьянскіх органаў друку, якія маюць на мэце перашкодзіць імкненьням Юга-Славіі да палепшаньня ўзаемаадносін з Італіяй. (ТАСС).

„Культурнае жыцьцё" румынскай арміі

ВЕНА, 8. Лібэральны «Віторул» прысьвячае артыкул культурнаму жыцьцю румынскай арміі. Газэта канстатуе, што з бэлетрыстыкі—салдаты чытаюць пераважна бульварныя раманы. «Што датычыцца палітычнай літаратуры, дык прыходзіцца канстатаваць, піша газэта, што ў апошні час шырока распаўсюджваюцца і карыстаюцца вялікім посьпехам пралетарская літаратура, камуністычныя брашуры і г. д. Асабліва гэта нагляднасьцца ў Бэсарабіі. Гэта літаратура распаўсюджваецца сярод салдат нелегальна».

Газэта прапануе арганізаваць палітычную і культурную контр-прапаганду «супроць рэвалюцыйнай атруты» шляхам адкрыцьця чытальняў пры вайсковых часьцях, паладжэньня бібліятэк-перасовак і выданьня брашур «выхаваўчага характару». Для барацьбы з камуністычнай прапагандай газэта прапануе таксама выданьне папулярнага штотыдневага органу для салдат. (ТАСС).

Ангельская газэта аб флёце ПАЗШ

ЛЁНДАН, 7. Марскі карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» адзначаючы, што кангрэс ПАЗШ зацьвердзіў марскі бюджэт у суме 72.050.000 фунтаў стэрлінгаў, падкрэсьлівае, што гэтая сума перавышае марскія асыгнаваньні Англіі на 16.000.000 фунтаў стэрл. Карэспандэнт дае наступную ацэнку флёту ПАЗШ:

«Амэрыканскі флёт раўнаецца нашаму па ліку капітальных суднаў, але забясьпечан вялікім лікам цяжкіх гармат, таму ён значна перавышае нас па ліку зьнішчыцеляў, падводных лодак і самалётаў і адстае ад нашага толькі па ліку крэйсэраў». (ТАСС).

Новы ангельскі ваенны аэрадром на Мальце

ЛЁНДАН, 7. З Мальты паведамляюць, што ў бліжэйшы час там будзе пабудаваны новы ваенны аэрадром ангельскіх паветраных сіл.

Гэтае паведамленьне мае вялікае значэньне з прычыны важнай стратэгічнай ролі Мальты. (ТАСС).

Стан чыгунак у Англіі

ЛЁНДАН, 11. Міністэрства шляхаў зносін Англіі адзначае, што ў 1928 годзе чысты прыбытак ангельскіх чыгунак зьнізіўся на 1.900.000 фунтаў стэрлінгаў у параўнаньні з 1927 годам. Уласна кажучы, гэтае зьніжэньне значна большае: у 1928 годзе агульная сума прыбыткаў складала 194.000.000 фунтаў стэрлінгаў супроць 202.400.000 фунтаў стэрлінгаў у 1927 годзе. Аднак, пэўная раўнавага была дасягнута скарачэньнем выдаткаў, якія ў 1928 годзе склалі 154.100.000 фунтаў стэрлінгаў супроць 160.600.000 фунтаў стэрлінгаў у 1927 годзе. Гэтае зьмяншэньне выдаткаў тлумачыцца ў першую чаргу скарачэньнем зарпляты чыгуначнікаў на 2½ проц.

Прыбыткі ад пасажырскіх зносін зьнізіліся ў 1928 годзе ў параўнаньні з 1927 годам на 1.500.000 фунтаў стэрлінгаў. Прыбыткі-жа ад таварных зносін зьнізіліся з 110.400.000 фунтаў стэрлінгаў у 1927 годзе да 103.300.000 фунтаў стэрлінгаў у 1928 годзе. (ТАСС).

Швэйцарская гандлёвая дэлегацыя ў СССР

БЭРЛІН, 12. Жэнэўскі карэспандэнт «Бэрлінэр Тагеблят» паведамляе, што ў зьвязку з прабываньнем прадстаўніка Парыскага гандлёвага прадстаўніцтва ў Бэрне, ідуць размовы аб тым, што швэйцарскія прамысловыя і гандлёвыя колы высоўваюць праект адпраўкі дэлегацыі ў Савецкі Саюз. (ТАСС).

На камісіі экспэртаў па рэпарацыях

Мэмарандум Нямеччыны

ПАРЫЖ, 18. Агэнцтва Гавас падае: «На пасяджэньні камісіі экспэртаў (па пераглядзе рэпарацый) нямецкі экспэрт Шахт агаласіў мэмарандум, у якім паданы меркаваньні адносна плацежаздольнасьці Нямеччыны і вызначаны ўсе ўмовы рэпарацыйных плацяжоў, якія Нямеччына лічыць прыемлімымі. Па вестках асьведомленых колаў, мэмарандум лічыць, што рэпарацыйныя плацяжы павінны адбывацца ня больш, чым на працягу 37-мі год, пры чым кожны гадавы ўнос павінен складаць каля 1 мільярду 660 мільёнаў марак».

Паводле агульнай думкі, няма ніякіх шансаў на тое, каб да нямецкіх контрпрапаноў аднесьліся, як да падставы для далейшага сур'ёзнага абгаварэньня пытаньня.

Прэм'ер Танака аб японска-кітайскіх адносінах

ТОКІЁ, 15. Прэм'ер Танака ў гутарцы з прадстаўнікамі друку, закранаючы ўзаемаадносіны паміж Японіяй і Кітаем заявіў, што перагаворы аб урэгуляваньні нанкінскага інцыдэнту (які меў мейсца ў лютым 1927 году) разьвіваюцца здавальняюча. Перагаворы аб пераглядзе япона-кітайскага гандлёвага дагавору пачнуцца пасьля ўрэгуляваньня гэтага інцыдэнту. Танака далей заявіў, што хаця кітайская ўлада ў сучасны момант сапраўды просіць Японію адтэрмінаваць эвакуацыю Шандуньскай правінцыі, усё-ж японскі ўрад намеран ажыцьцёвіць эвакуацыю паводле распрацаванага пляну ў назначаны тэрмін.

У заключэньне Танака падкрэсьліў паступовае «уціхамірэньне» антыяпонскага руху ў Кітаі. (ТАСС).

Паветраныя „таксі" у Лёндане

ЛЁНДАН, 11. Пачынаючы з чэрвеня Лёндан будуць абслугоўваць так званыя «паветраныя таксі»—самалёты. У адным з прыгарадаў Лёндану будуецца спэцыяльны аэрадром для такіх «таксі».

«Паветраныя таксі» назначаны для палётаў ва ўсе часьці краіны пры аплаце з рахунку адзін шылінг (каля 48 кап.) за мілю. Некаторыя «паветраныя таксі» маюць залі для скокаў, тэнісовыя пляцоўкі і рад іншых прыстасаваньняў, патрэбных «для культурнага ангельца».

У першы час лінія будзе абслугоўвацца 16-цю «таксі». Для інструктаваньня аб правілах карыстаньня «таксі» вылучан спэцыяльны кадр інструктароў. (ТАСС).

АНГЕЛЬСКА-САВЕЦКІЯ АДНОСІНЫ

Кансэрватыўны орган за адваўленьне дыплёматычных адносін

ЛЁНДАН, 15. Штотыднёвік кансэрватыўнага напрамку «Спэктэйтор», зьмяшчае ў апошнім нумары артыкул пад загалоўкам «Здаровы сэнс на повадзе Расіі». Штотыднёвік рашуча дамагаецца аднаўленьня дыплёматычных адносін паміж Англіяй і СССР пры ўмове, калі савецкі ўрад дасьць патрэбныя запэўненьні для таго, каб палегчыць парманьныя адносіны ў галіне крэдыту і фінансаў паміж абедзьвюма краінамі. У заключэньне штотыднёвік заяўляе, што прадпасылкай для ўсякага палепшаньня ангельска-савецкіх адносін павінна быць аднаўленьне парманьных адносін паміж абедзьвюма краінамі. Весткі, атрыманыя карэспандэнтам ТАСС у аўтарытэтных колаў, пацьвярджаюць, што Балдуін прыняў меры для таго, каб атрымаць даклад ад членаў дэлегацыі ангельскіх прамыслоўцаў.

У фашысцкай Польшчы

Арышты ў Лодзі

ВАРШАВА, 17. Паліцыя ў Лодзі арыштавала 5 чалавек, па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да Лодзінскага акружовага камітэту кампартыі. Арышт адбыўся ў аднэй з прыватных кватэр. Двое з былых у кватэры выскачылі праз вакно на вуліцу, пры чым адзін з іх разьбіўся на сьмерць. («К. Пор.»).

Выплата 200 мільёнаў замежнага доўгу

ВАРШАВА, 16. У бягучым бюджэтным годзе Польшча павінна заплаціць замежным банкірам 198.789.223 злотых у якасьці процэнтаў і на часткове пагашэньне атрыманых пазык. («Роб.»).

Канфіскацыя „Тараса Бульбы"

ВІЛЬНЯ, 12. Каламыйскае староства («Усх. Галіцыя») канфіскавала ўвесь тыраж «Тараса Бульбы», выданы Каламыйскім выдавецтвам «Око». («В. Крыніца»).

Забарона Бэрлінскае оперы ў Сілезіі

ВАРША

НАПЯРЭДАДНІ XVI КАНФЭРЭНЦЫІ ЎсеКП(б)

Сканцэнтраваць рашучы агонь супроць правага ўхілу

ПРАВЫМ КАПІТУЛЯНТАМ ПАРТЫЯ НЕ ДАЗВОЛІЦЬ РЭВІЗАВАЦЬ ЛЕНІНІЗМ, ПАРУШАЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ БАЛЬШАВІЗМА І ПАРТЫЙНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

Як мага лепш падрыхтаваць партыйныя масы да генэральнай чысткі партыі

Мацней ударыць па правым ухіле

Усю сваю сілу і энергію кожны камуністы павінен накіраваць на справу ажыццяўленьня генэральнае лініі партыі

Факты апошняга часу гавораць пра тое, што барацьба супроць правага ўхілу і прымірэнцтва павінна быць ня толькі не паслаблена, а ў некалькі дзесяткаў раз узмоцнена. Папершае, таму, што правыя ўкланістыя не адмаўляюцца ад сваіх антыленінскіх пазыцый, а наадварот, яны актывізуюць сваю барацьбу, узбагачаюць свой антыпартыйны арсэнал новымі «досьпехамі» для барацьбы супроць партыі, пазычаючы іх у старых ухілаў і груп, многія з якіх так ганебна скончылі сваё існаваньне. Падругое, разгорнутае сацыялістычнае наступленьне выклікае шалёнае супраціўленьне варожых камунізму элемэнтаў. Труднасьці, якія сустракаюцца на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, парджаюць хістаньні ў асобных праслойках рабочае клясы і сярод асобных членаў партыі. Усё гэта зьяўляецца спрыяючай глебай для правых настрояў. Патрэцце, барацьба па выкрыцьці правых ухілістых праводзіцца невыстарчальна.

Пачацьвертае, неабходнасьць узмацненьня барацьбы супроць правай небясьпекі выклікаецца тым, што мы ўсё часьцей сустракаем у нашых партарганізацыях тых партыйцаў, якія зьяўляюцца канкрэтнымі насіцелямі правага ўхілу. Наш друк на сваіх старонках ня мала зарэгістраваў фактаў, калі некаторыя камуністы ў сваёй практычнай рабоце адбівалі самым выразным парадкам «правыя тэорыі», калі канкрэтныя насіцелі правых настрояў прабавалі прапагандаваць свае погляды, праўда, «погляды» поўныя бязглузьдзіцы, якія сьведчаць пра тое, што насіцелі гэтых «поглядаў» сталі на шлях абароны кулака, нэпмана, дробнага буржуа.

Член партыі Крамс з Мазырскай арганізацыі (гл. «Зьвязду» № 81) прапануе «даць магчымасьць разьвівацца капіталістычным элемэнтам», бо інакш, па яго думцы, цельга пасьняхова будаваць сацыялізм. А член партыі з 1919 году Лук'яненка з ячэйкі пэдфаку ВДУ пры абгаваранньні тэзісаў т. Калініна на сходзе ячэйкі з мэтай прапаганды сваіх апартуністычных поглядаў выступае і сіліцца давесьці неабходнасьць таго, што зараз трэба «адмовіцца ад арганізацыі калгасаў і саўгасаў», «ня ўмешацца ў справу разьвіцьця сельскае гаспадаркі», ён раіць дазволіць фабрыкантам адчыніць прыватныя скураныя і іншыя прадпрыемствы, каб, бачыце, селянін «мог купіць на боты тавару»...

Гэтыя выступленьні лішні раз гавораць пра тое, што барацьба супроць правага ўхілу, супроць капітулянцкіх панікёрскіх настрояў павінна быць узмоцнена.

Кожны партыец павінен ведаць, што барацьба супроць правага ўхілу, барацьба за генэральную лінію партыі, за практычнае не ажыццяўленьне гэта—вялікая напружаная работа, якая вымагае вялікай энэргіі і сіл партыі і ўсіх сьвядомых рабочых. Гэта работа ўключае ў сябе ня толькі выкрываньне капітулянцкіх дробна-буржуазных тэорый правых перад шырокімі партыйнымі масамі, але і барацьбу за практычнае ажыццяўленьне курсу партыі ў такіх канкрэтных пытаньнях, як індустрыялізацыя краіны і калектывізацыя сельскае гаспадаркі.

Барацьба супроць правага ўхілу і прымірэнцтва павінна забясьпечыць ня толькі разгром ідэалёгіі правых ухілістых, але і практычную рэалізацыю таго курсу, тэй генэральнай лініі, за якую вядзе барацьбу партыя з правымі апартуністымі. Хто гэтага не разумее, той абмяркоўвае барацьбу супроць правых ухілістых, барацьбу па выкрыцьці іх ідэёвай пазыцыі і забывае пра вялізную практычную работу на рэалізацыі дырэктыў партыі, той ня зусім выразна разумее сутнасьць барацьбы партыі, той выпустошвае асноўнае, за што вядзе барацьбу партыя.

Барацьба супроць правага ўхілу—гэта барацьба супроць спроб з боку апартунізму рэвізаваць ленінскае вучэньне, супроць іх капітулянцкага курсу ў нашым будаўніцтве, які азначае разьвязваньне капіталістычных элемэнтаў у краіне, паслабленьне пазыцый пралетарскай дыктатуры.

Задача кожнага партыйца заключаецца ня толькі ў тым, каб выкрыць апартуністычную сутнасьць правых ухілістых, але і рабіць усё, што ад яго залежыць, для таго, каб ленінскі курс у нашым будаўніцтве, за які змагаецца партыя, ажыцьцяўляўся практычна, ажыцьцяўляўся на справе.

Л. П.

Рыхтуемся да чысткі

Ячэйкі не змаглі ўвязаць пытаньняў падрыхтоўкі да чысткі з вярбоўкай у партыю перадавых рабочых і батракоў

Сваячасовая распрацоўка дырэктыў партыі аб генэральнай чыстцы партыйных радоў, пастаноўка пытаньняў чысткі на пленумах парткомаў, на сходах актыву як у горадзе, так і ў раёнах, на бюро ячэек, дала адпаведныя станоўчыя вынікі ў справе ўсьведамленьня партыйнымі масамі палітычных задач чысткі партыі.

Раённыя партарганізацыі ўжо правялі партыйныя сходы в удзелам батрацтва, беднаты, с.-г. рабочых па абгаварэньні пытаньня чысткі. Ва ўсіх ячэйках прыцягненьне на сход беспартыйных—батрацтва, беднаты—практыкавалася пэрсанальным спосабам.

Да кожнай вясковай ячэйкі на час усёй падрыхтоўчай работы да чысткі па дырэктыве АКК праз РК прымацоўваліся прадстаўнікі райкому, якія наперад інструктаваліся на пытаньнях правядзеньня чысткі. На сходах вясковых ячэек пры абгаварэньні пытаньняў чысткі прысутнічала шмат беднаты, батрацтва. Напрыклад, толькі на сходах 69 ячэек прысутнічала 2.474 чал. беспартыйных батракоў і бядняцкага сялянства.

Актыўнасьць на сходах была вялікая.

На сходах з 46 вясковых ячэек, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб чыстцы партыі, у спрэчках выступіла 343 камуністых, 130 камсамольцаў і 493 беспартыйныя.

Дзякуючы таму, што пастаноўка пытаньняў аб чыстцы на сходах была наперад падрыхтавана, на сходах выступаўшыя высунулі рад дзелавых прапаноў, рад момантаў, якія выкрываюць антыпартыйныя ўчынкі, што маюць за сабою асобныя камуністы.

На сходы гарадзкіх ячэек па абгаварэньні пытаньня чысткі партыі таксама былі пырока ўцягнуты беспартыйныя рабочыя. У некаторых вытворчых ячэйках на сходах прысутнічаў амаль увесь актыў прадпрыемстваў. Спрэчкі, асабліва на сходах вытворчых ячэек, групаваліся наўкола канкрэтных фактаў становішча і кіраўніцтва вытворчасьцю з боку ячэйкі, наўкола адмоўных момантаў у паводзінах асобных партыйцаў на прадпрыемстве.

Поруч з тым, што ў савецкіх ячэйках абгаварэньне пытаньняў чысткі прайшло дрэнна, некаторыя ячэйкі нават «умудрыліся» праводзіць сходы вакрытыя (яч. адмаддзелу). У рабоце па падрыхтоўцы да чысткі пытаньне аб вярбоўцы і рабоце партыі не знайшло свайго адбітку як у горадзе на вытворчых ячэйках, так і ў вясковых. Большасьць ячэек не арганізавала сваю работу так, каб падрыхтоўку да чысткі ўвязаць з вярбоўкай у партыю перадавых рабочых і батракоў.

Друк, насьцепгазэты, рабселькоры ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да чысткі партыі не занялі свайго належнага месца. Насьценныя і нават акруговыя газэты асьвятлялі пытаньні чысткі выпадкова несыстэматычна.

У сучасны момант праведзеная акруговая нарада рабселькораў абяцае даць належныя вынікі, аб гэтым сьведчыць рад паступаючых матар'ялаў і заметак у рэдакцыі, райкомы і КК.

Л. Б—скі.

Ад кого мы ўжо вызваліся

(Партыйны калектыў „Меншвэю")

Нядаўна наш калектыў выключыў са сваіх радоў 2-х «камуністых». Хто яны такія?

Столяр Б.—член партыі з 1925 году. За недысцыплінаванасьць на вытворчасьці і нядбайныя адносіны да працы ён ужо некалькі раз атрымліваў розныя спагнаньні па адміністрацыйнай лініі. Аднак, нішто на Столяра ня ўплывае. Ён лічыць, што рабочыя яе павінны быць зацікаўлены інтарэсамі прадпрыемства, што яны павінны абараняць толькі свае асабістыя шкурніцкія інтарэсы.

Доўгі час Столяр утоньваў свой настрой ад парткалектыву і рабіў сваю «справу» ціха. Ён настройваў асобных рабочых супроць лініі партыі, горача абараняў трацкістых і, калі супроць апошніх прымаліся рашучыя меры, ён пускаў па адрасе партыі і савецкай улады самую злосную лаянку.

Нарэшце, Столяр адкрыў свой сапраўдны твар. Ён падаў заяву на імя бюро парткалектыву, у якой твар Столяра, як заядлага трацкістага, адкрыўся в поўнай выразнасьці.

Другая—**Зусіна Л.**—член партыі з 1920 г., былая бундыстка. Яе тактыка не разыходзіцца з тактыкай Столяра.

У нас эксплёатуюць рабочых, ячэйка і фабком не зьяўляюцца абаронцамі нашых інтарэсаў, а таму...

--- Навошта вам сьпяшацца, пасьпееце, расцянкі ўсё роўна нізкія,—агітавала яна работніц і рабочых.

Яна—таксама стаіць на пункце погляду трацкістых.

Правільна зрабіў парткалектыў, выкінуўшы абодных «камуністых» з радоў партыі.

С. Г.

Партыйная хроніка

У Фрунзаўскім районе КП(б)Б

Прэміяваньне лепшых таварышоў па распаўсюджаньні „Правды", „Зьвязды" і часопісі „Бальшавік"

Нарада апоргаў Фрунзаўскага райкому КП(б)Б знайшла патрэбным прэміяваць лепшых таварышоў па распаўсюджаньні газэт «Правда», «Зьвязда» і часопісі «Бальшавік» дармовай выпіскай тэй-жа літаратуры на поўныя тэрміны. Бюро Фрунзаўскага райкому згадзілася з гэтай думкай нарады апоргаў.

Праверка беларусізацыі

Фрунзаўскі РК КП(б)Б вылучыў камісію для праверкі ячэек КП(б)Б у справе выкананьня дырэктыў партыі па беларусізацыі. Камісія прыступіла ўжо да працы. У першую чаргу абсьледуюцца тыя ячэйкі, якім пры мінулай праверцы былі даны канчатковыя тэрміны для пераводу сваёй працы на беларускую мову.

На ўзмацненьне антырэлігійнай работы

Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б пастанавіла вылучыць групу з 0 прапагандыстых спэцыяльна для антырэлігійнай работы.

Гэтыя таварышы будуць вызвалены ад іншых партыйных нагрузак з тым, каб яны маглі ўсю ўвагу аддаць антырэлігійнай рабоце.

Кожны камуністы--сельскі гаспадар павінен быць калгасьнікам

Абгаварэньне тэзісаў тав. Калініна

ГАРАДОЦКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ КП(б)Б (Віцебшчына) на адным са озвіх раённых сходаў абгаварыла тэзісы т. КАЛІНІНА да XVI Усесаюзнай канфэрэнцыі УсеКП(б). Пры абгаварэньні выступіла звыш 20 таварышоў, якія паказалі на неабходнасьць дэтальнай прапрацоўкі тэзісаў ва ўсіх ячэйках раённай арганізацыі.

Сход аднагалосна прыняў рэзалюцыю, у якой поўнасьцю далучаецца да тэзісаў і намеціў рад практычных мерапрыемстваў па іх ажыцьцяўленьні. У прыватнасьці сход абавязаў усіх членаў раённай арганізацыі, працуючых на сельскай гаспадарцы ўступіць у калгасы.

А.

Гнаць Іванавых з партыі

(Ячэйка КП(б)Б Мсьціслаўскага пэдагагічнага тэхнікуму, Аршанскай акругі)

Сярод асобных партыйцаў ячэйкі КП(б)Б Мсьціслаўскага пэдагагічнага тэхнікуму заўважваюцца яўна кулацкія настроі. Некаторыя адкрыта заяўляюць аб тым, што зара на вёсцы няма ніякай клясавай барацьбы, што ўсё сялянства роўнае і г. д.

Так, напрыклад, член партыі **Іваноў**, сакратар камсамольскай ячэйкі пэдагагічных курсаў, сказаў: **«Я лепш буду абараняць інтарэсы сына абшарніка, чым батрака»**.

Ня дзіва пасьля гэтага, што гэтыя настроі распаўсюдзіліся сярод некаторай часткі беспартыйных студэнтаў. Бюро ячэйкі КП(б)Б сваячасова на гэта рэагавала. На партсходах былі дэтальна прапрацаваны пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і XII-га зьезду КП(б)Б. Пры прапрацоўцы гэтых пытаньняў асаблівая ўвага зьвярталася на растлумачэньне апартуністычнай сутнасьці правага ўхілу і прымірэнцтва да яго. Мсьціслаўскі райком ЛКСМБ распусьціў бюро камсамольскай ячэйкі пэдкурсаў і правёў датэрміновыя перавыбары.

МАЛЫ.

Менакругком КП(б)Б паведамляе,

што ў нядзелю, 21-га красавіка, а 10½ гадз. раніцы, у ніводзе Саўгандальолучачых адбудзецца нарада па пытаньні аб нашых гаспадарчых цяжкасьцях,

Дакладчык тав. БЭНЭК.

Выклікаюцца сакратары ячэек КП(б)Б гор. Менску, прапагандыстыя, агітатары, фракцыі ЦП саюзаў, фракцыі фабзаўмасцкомаў.

Плян дакладу аб 1 маі

УСТУПНАЯ ЧАСТКА

1) 1-га мая—дзень праверкі міжнародным пралетарыятам баявой гатоўнасьці сваіх радоў да ажыцьцяўленьня задач, што стаяцца перад ім бягучым этапам «эпохі войнаў і пралетарскіх рэвалюцый».

2) Асаблівае значэньне міжнароднага сьвята працы ў гэтым годзе ў сувязі з дэсэсіцэ'ньздзем Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

ПРАЛЕТАРЫЯТ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН У ДЗЕНЬ 1-га МАЯ

1) VI кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыяналу ўстанавіў, што асаблівасьць сучаснага міжнароднага становішча ў тым, што імпэрыялізм падрыхтоўвае новую імпэрыялістычную бойню, накіроўваючы яе ў першую чаргу супроць СССР.

Задачы пралетарыяту капіталістычных краін у барацьбе супроць новай вайны, што падрыхтоўваецца імпэрыялістымі: а) выкрываць кожны ваенны крок буржуазіі, б) падрыхтаваць свае рады да практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу «вайна вайне» і «абарона Савецкага Саюзу», даючы рашучы адпор «аднэй з форм абдурваньня рабочае клясы» (Ленін) — буржуазнаму і асабліва сацыял - дэмакратычнаму пацыфізму, якія разбройваюць пралетарыят капіталістычных краін у яго барацьбе супроць новай імпэрыялістычнай вайны, в) актыўная падрыхтоўка да міжнароднага чырвонага дня барацьбы супроць імпэрыялізму, згодна пастановы VI кангрэсу Камінтэрну, выкрываючы ашуканства мас сацыял-патрыётамі—актыўных агэнтаў буржуазіі, у падрыхтоўцы новай імпэрыялістычнай вайны (ваенная праграма нямецкай сацыял-дэмакратыі).

Задачы пралетарыяту Савецкага Саюзу ў барацьбе супроць новай імпэрыялістычнай вайны: а) няўхільнае ажыцьцяўленьне палітыкі міру, б) далейшая барацьба за поўнае і ўсеагульнае разброеньне, в) падрыхтоўка сваіх радоў да адпору спробам разграміць фарпост сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі ўзброенай сілай.

2) Абвастрэньне клясавай барацьбы ў капіталістычных краінах. Нарастаньне новай хвалі наступальных баёў пралетарыяту супроць капіталу. Буйныя забастоўкі ў Нямеччыне і Польшчы, Францыі і Чэха-Славакіі, у вугальнай і тэкстыльнай прамысловасьці, абвастрэньне штодзённай барацьбы мас супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, супроць узросшай эксплёатацыі, за павышэньне заработнай платы і г. д. Актыўная дапамога сацыял-дэмакратыі капіталу зрывам забастовак, пропаведзьдзю «прамысловага міру» ў эканоміцы і «кааліцыі з буржуазіяй» у палітыцы. Пераход сацыял-дэмакратаў да адкрытых выступленьняў на абарону эксплёатарскіх прыбыткаў буржуазіі—бюджэт Гільфэрдынга ў Нямеччыне.

3) Нарастаньне новай рэвалюцыйнай хвалі ў калёніяльных і паўкалёніяльных краінах. Уздым рэвалюцыйнай хвалі ў Індыі, тэкстыльная забастоўка, масавыя дэманстрацыі ў Бамбэі і Калькуце, усеагульная забастоўка ў Бамбэі і г. д. Задачы міжнароднага пралетарыяту: падтрыманьне індыйскай рэвалюцыі, барацьба супроць сацыял-дэмакратыі, якая сапкцыянуе імпэрыялістычнае грабежніцтва «сваёй» буржуазіі, якая ў прыватнасьці дапамагае ёй у барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху ў Індыі пасаджэньнем рэфармізму ў рабочым руху Індыі.

4) Клясавыя інтарэсы пралетарыяту ў яго барацьбе супроць новай вайны, супроць капіталізму за дыктатуру пралетарыяту патрабуюць рашучай і адкрытай барацьбы супроць агэнтаў капіталізму ў рабочай клясе сац.-дэмакратаў, а таксама супроць новага саюзьніка сацыял-дэмакратаў—контр - рэвалюцыянэраў трацкістых, што дапамагаюць сацыял-дэмакратыі: а) расколваць рабочую клясу, б) дыскрэдытаваць у вачох рабочых перадавы атрад сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі—рабочую клясу СССР—паказам нашай краіны краінай тэрмідору, а яе авангарду УсеКП(б)—прыхільніцай прыватнай уласнасьці (апошняе выступленьне Троцкага ў кансэрватыўнай газэце «Дэйлі Экспрэс»).

5) Арганізацыйнае і ідэёвае адзінства радоў Камуністычнага Інтэрнацыяналу—умова падрыхтоўкі камуністычнага авангарду да кіраўніцтва наступальнай барацьбой рабочае клясы. Шлях да забесьпячэньня гэтага: барацьба на два франты — як супроць «ультра-левых», так і асабліва супроць правага ўхілу і прымірэнцтва з ім, асабліва небясьпечнага ў трэці перыяд пасьляваеннага разьвіцьця капіталізму.

ПРАЛЕТАРЫЯТ СССР У ДЗЕНЬ 1-га МАЯ

1) Адрозьненьне ўмоў, у якіх 12 год сьвяткуе міжнародны дзень працы рабочая кляса Савецкага Саюзу, ад умоў, у якіх сьвяткуе яго пралетарыят Захаду.

2) Міжнародны характар сьвята 1-га мая ў СССР. Абавязкі рабочае клясы нашай краіны ў справе падтрыманьня барацьбы пралетарыяту на Захадзе і рэвалюцыйнага руху працоўных калёній і паўкалёній. Міжнародны характар будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

3) 1 мая ў СССР—дзень праверкі актыўнасьці радоў рабочае клясы СССР на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Неабходнасьць яшчэ большага згуртаваньня і актыўнасьці рабочых мас у іх будаўнічай рабоце, у зьвязку з абвастрэньнем супраціўленьня будаўніцтву сацыялізму з боку клясавых ворагаў у горадзе і вёсцы. Рашучае перамаганьне спроб клясавых ворагаў разлажыць пасобныя атрады арміі будаўнікоў сацыялізму шляхам сеньня нацыянальнай варожасьці—антысэмітызму, пашырэньня рэлігійнага ўплыву і г. д.

4) Труднасьці сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР (таварны голад, хлебныя затрудненьні і г. д.), якія скарыстоўваюцца ворагамі рабочае клясы для сеяньня панікі ў радох рабочае клясы і адцягненьня яе ад задач будаўніцтва сацыялізму. Два шляхі выхаду з затрудненьняў: а) няўхільны для рабочае клясы СССР шлях адмаўленьня ад фарсаванага наступленьня на кулака і капіталістычныя элемэнты, разьвязваньне разьвіцьця капіталізму ў СССР і адмаўленьня ад забесьпячэньня эканамічнай самастойнасьці краіны; б) адзіны, адпавядаючы інтарэсам рабочае клясы, шлях вынішчэньня труднасьцяй шляхам шпаркага тэмпу індустрыялізацыі, побач з дапамогаю ўздыму бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак, далейшага разьвіцьця калектывізацыі і будаваньня саўгасаў, далейшага наступленьня на кулака і капіталістычныя элемэнты ў краіне.

5) Важнейшая задача ўмацаваньня сацыялістычнай прамысловасьці і забесьпячэньня ўзятага тэмпу індустрыялізацыі—зьніжэньне сабекошту ў гэтым годзе на 7 проц. Невыстарчальнасьць выкананьня гэтай дырэктывы. Адна з асноўных прычын гэтага — нявысокая прадукцыйнасьць працы, якая адстае ад плянавых меркаваньняў, і заняпад працоўнай дысцыпліны. Задача рабочае клясы—актыўны ўдзел у сацыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці, барацьба шляхам сацыялістычнага спаборніцтва за ўздым дысцыпліны працы, супроць дробна-буржуазных анархічных адносін да працы на сацыялістычным прадпрыемстве.

6) Другая важнейшая задача гаспадарчага будаўніцтва ў СССР побач з індустрыялізацыяй — падцягваньне сельскае гаспадаркі, якая праўмерна адстае ў сваім уздыме ад тэмпу росту прамысловасьці. Дапамога і стымуляваньне ўздыму гаспадаркі беднякоў і сераднякоў (палітыка цэн, новы закон аб с.-г. падатку). Неадлучнасьць задачы сапраўды магутнага ўздыму сельскае гаспадаркі, якой ставяцца граніцы невялікімі разьмерамі дробных і драбнейшых гаспадарак беднякоў і сераднякоў, ад яе калектывізацыі. Задачы рабочае клясы ў справе дапамогі калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

7) Харчовае становішча краіны і забесьпячэньне рабочае клясы. Неабходнасьць узмацненьня ўвагі рабочае клясы і дапамогі з боку рабочых, зьвязаных з вёскай, ходу хлебазагатовак, бо нармальны ход хлебазагатовак забясьпечыць бесьперабойнае забесьпячэньне хлебам рабочае клясы, армії і сялянства спажываючых раёнаў. Барацьба за эканомію ў выдаткаваньні хлеба, супроць спэкуляцыі хлебам.

8) Прыцягненьне мас да будаўніцтва і барацьбы за якасьць гэтага будаўніцтва. Лёзунг самакрытыкі, ачышчэньне дзяржаўнага і прафэсыянальнага апарату ад сацыяльна-чужых элемэнтаў і бюракратаў. Арабочаньне дзяржаўнага і прафэсыянальнага апарату, як шлях набліжэньня яго да мас працоўных нашай краіны. Выкананьне і яго вынікі.

9) Павышэньне культурнага ўзроўню рабочае клясы, ліквідацыя няпісьменнасьці, увядзеньне ўсеагульнага навучаньня, павышэньне тэхнічнай пісьменнасьці—умовы яшчэ больш магутнага росту ўдзелу рабочых у будаўніцтве, набыцьця імі «навыкаў у справе кіраваньня краінай».

10) Пралетарыят СССР дабіваецца новых посьпехаў на шляху да сацыялізму, перамагае труднасьці пад кіраўніцтвам сваёй партыі—УсеКП(б), выпрабаванай і загартаванай у баёх за дыктатуру пралетарыяту, за захаваньне гэтай дыктатуры, за камунізм.

Забесьпячэньне ідэёвай згуртаванасьці, барацьба на два франты—з трацкіскімі настроямі ў партыі і асабліва супроць галоўнай небясьпекі для адзінства радоў партыі зараз—правых апартуністычных элемэнтаў і хістаньняў—умова баявой гатоўнасьці партыі да перамаганьня труднасьцяй, няўхільнага прасоўваньня на ленінскім шляху да ажыцьцяўленьня канчатковай мэты рабочае клясы. Умацаваньне сувязі партыі з рабочай клясай—зарука далейшых посьпехаў будаўніцтва сацыялізму. Ачышчэньне радоў партыі ад сацыяльна чужых элемэнтаў, а таксама ад элемэнтаў, якія абюракраціліся і перарадзіліся, і побач з гэтым рост партыі за лік перадавых рабочых яшчэ больш умацуюць гэтую сувязь.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Усю творчую энэргію і пралетарскую актыўнасьць на перамаганьне труднасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва

Сацыялістычны дагавор заводаў „Чырвоны Мэталісты" і „Камінтэрн"

Камінтэрнаўцы і чырвоныя мэталістыя абавязваюцца выконваць усе ўрадовыя дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі і павышэньні прадукцыйнасьці працы і выклікаюць на спаборніцтвы рад іншых беларускіх прадпрыемстваў

Заслухаўшы паведамленьне аб пастанове пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньні аб падняцьці працоўнай дысцыпліны і зьніжэньні сабекошту, мы, рабочыя і адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал чырвонаштандартнага заводу «Чырвоны Мэталісты», **поўнасьцю ўхваляем усе пастановы партыі па гэтым пытаньні і абавязваемся энэргічна ажыцьцяўляць іх.**

Рабочая кляса савецкай краіны пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дабілася вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Але на нашым шляху мы сустракаемся з вялікімі труднасьцямі, якія галоўным чынам вынікаюць з тэхнічнай адсталасьці прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. На перамогу гэтых труднасьцяй трэба мабілізаваць усю творчую энэргію, пралетарскую актыўнасьць і ўвагу ўсяе рабочае клясы.

Прызнаючы, што адным з тормазаў, якія перашкаджаюць далейшаму прасоўваньню наперад, зьяўляецца ня досыць высокая працоўная дысцыпліна на вытворчасьці, неразуменьне з боку некаторых адсталых рабочых, якія нядаўна прышлі на вытворчасьць сваіх задач і абавязкаў перад сацыялістычнай вытворчасьцю, мы прызнаем неабходным **ужыць цэлы рад тэрміновых мер для паляпшэньня вытворчасьці, узьняцьця працоўнай дысцыпліны, самай жорсткай і рашучай барацьбы з прагульшчыкамі і гультямі на вытворчасьці, накіраваць усе намаганьні на паляпшэньне якасьці прадукцыі і максымальна магчымае падняцьце прадукцыйнасьці працы.**

Мы, рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводаў «Чырвоны Мэталісты» і «Камінтэрн» заключаем гэты гаспадарча-палітычны дагавор з гаспадарчымі органамі і ўрадам і абавязваемся:

1. У самы кароткі тэрмін дабіцца ўстанаўленьня цьвёрдай сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны на нашых прадпрыемствах. Абавязваемся праводзіць самую рашучую і жорсткую барацьбу з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны, а непапраўных і алосных прагульшчыкаў будзем выкідваць з вытворчасьці.

2. Прыняць самыя энэргічныя меры да паляпшэньня якасьці прадукцыі давядзеньня да мінімуму процанту глуму, цьвёрда памятаючы, што нашы прадпрыемствы выробляюць прадукцыю, якая непасрэдна служыць справе рэканструкцыі і падняцьця тэхнікі сельскае гаспадаркі.

3. **Даем цьвёрдае абяцаньне ў самы кароткі тэрмін дабіцца зьніжэньня сабекошту прадукцыі на 7 проц. і поўнага 100 процантнага выкананьня вытворчай праграмы.**

Для выкананьня гэтага абавязацельства мы, рабочыя заводаў «Чырвоны Мэталісты» і «Камінтэрн», пад кіраўніцтвам парткалектыву і заўкому разгорнем шырокую масавую выхаваўчую работу па растлумачэньні ўсіх задач, што стаяць перад сацыялістычнай прамысловасьцю, **прымем усе неабходныя меры да ажыўленьня дзейнасьці вытворчых нарад і часовай кантрольнай камісіі,** прымем самы актыўны ўдзел у распачатым па ініцыятыве камсамолу вытворчым паходзе і ўсямерна на падтрымаем заводакіраўніцтва і тэхнічны пэрсанал на ўсёй яго рабоце па ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны, паляпшэньні якасьці гаспадарчага кіраўніцтва і лепшай арганізацыі працы на прадпрыемствах.

Даючы гэтае абавязацельства ўраду і камуністычнай партыі Беларусі, мы заклікаем усе прадпрыемствы гораду Віцебску, прадпрыемствы Белмэталятрэсту «Пралетары» і «Рухавік Рэвалюцыі» ў Гомелі, заводы «Энэргія» і «Камунар» у Менску, заводы «Чырвоны Кастрычнік» і «Інтэрнацыянал» у Воршы і Рэчыцы пасьледаваць нашаму прыкладу.

Няхай жыве сацыялістычная вытворчая дысцыпліна!

Абвесьцім рашучы паход супроць прагульшчыкаў і парушальнікаў працоўнай дысцыпліны!

Усе сілы рабочае клясы на барацьбу за якасьць прадукцыі і зьніжэньне сабекошту!

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі з посьпехам пераможам усе труднасьці на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Рабочыя чырвонаштандартнага заводу «Чырвоны Мэталісты і заводу «Камінтэрн».

Даеш 12 процантаў!

Гомельскія шчаціншчыкі прыкладна вядуць спаборніцтва

Гомельскія шчаціншчыкі некалькі дзён таму назад кінулі выклік шчаціншчыкам іншых прадпрыемстваў Беларусі, ставячы задачай зьніжэньне сабекошту на 12 проц. і максымальнае памяншэньне процанту страты шчаціны.

Створаны з прадстаўнікоў усіх фабрычных арганізацый штаб па правядзеньні спаборніцтва ўжо прыступіў да справы.

Спаборніцтва абудзіла ў рабочых ініцыятыву. Ад паасобных рабочых, груп, цэхаў блаўпынна паступаюць прапановы вытворчага характару, заўвагі і выклікі. Вылучаныя для ўліку гэтых прапаноў таварышы ледзь пасьпяваюць іх улічваць. Характэрна, што некаторыя рабочыя, якія да гэтага часу былі пасыўнымі да вытворчасьці, зьяўляюцца зараз падбухторшчыкамі ў спаборніцтве.

Цікава праводзіцца спаборніцтва паміж паасобнымі калектывамі. Пасьля пастановы зрабіць выклік, калектыў вылучае дэлегацыю для перагавораў. Потым, па сканчэньні работы, наладжваецца лятучы мітынг груп рабочых, што ўступаюць у спаборніцтвы. Мітынг адбываецца ў цэхы, ля варштатаў. Тут выпрацоўваюцца ўмовы, якія падпісваюцца прадстаўнікамі груп і вывешваюцца на сьцяне.

Асноўны лёзунг спаборніцтва: максымальнае зьніжэньне колькасьці страты і паляпшэньня якасьці. Гэта вусім зразумела. Калі ўдасца фабрыцы зьнізіць страты хоць-бы на 3 проц., то і гэта дасьць ёй некалькі дзесяткаў пудоў сырцу, а зьніжэньне сабекошту выявіцца ў 6-7 проц.

Магчымасьцяй зьніжэньня сабекошту шмат. Падамо два характэрныя факты.

Паводле падлікаў вытворчай камісіі мяшальная машына павінна даць у месяц 3.800 кгр. зьмешанай шчаціны, а яна ў студзені дала толькі 2.200 кгр. Недавыпрацоўка 1.600 кгр. атрымалася з прычыны невыстарчальнага кантролю над работай машыны. Гэта папершае. Падругое, кваліфікаваныя рабочыя, што стаяць ля машыны, часта выкопвалі работу чорнарабочага і займаліся разноскай фабрыкату па цэхах.

Наглядзецца дарэмная топка вялікай печы да нагрузкі яе шчаціной для сушкі. Дровы выдаткоўваюцца, а шчаціны для поўнай нагрузкі печы не хапае.

Вялікую ролю ў спаборніцтве павінны адыграць рабкоры. вядучы барацьбу за моцную дысцыпліну праз насьценгазэту і асьвятляючы ў друк ход спаборніцтваў. Яны прымацоўваюцца да працуючых ударных груп. Сход рабкораў пастанавіў выпускаць насьценгазэту кожны тыдзень. Акрамя таго ён зьвярнуўся да рабкораў Віцебскай, Менскай і Бабруйскай шчацінных фабрык з заклікам—прыняць самы актыўны ўдзел у спаборніцтве.

Н. Л.

Канкрэтны адказ

(Ліст Белпапертрэсту да рабочых фабрыкі „Прафінтэрн" у Н.-Барысаве)

Ад імя Белпапертрэсту вітаю прафінтэрнаўцаў з прыняцьцем імі выкліку і ўступленьнем у сацыялістычнае спаборніцтва.

Цьвёрдая рашучасць, з якою вы прынялі выклік, зьяўляецца найлепшай зарукай таго, што вы таксама цьвёрда, парабочаму пойдзеце на шляху ажыцьцяўленьня пастаўленых перад сабой задач па давядзеньні сярэдня-сутачнай выпрацоўкі да 10 тон паперы і зьніжэньня сабекошту ў такім разьмерах, каб ня толькі пакрыць павышэньне мінулага паўгодзьдзя, але выканаць поўнасьцю гадавое заданьне па прамфінпляне ў 10,6 проц.

Значны недавыраб першага паўгодзьдзя па вашай фабрыцы патрабуе асабліва напружанасьці ўсіх рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

Што-ж датычыць вопраткі для машын, у прыватнасьці сукнаў, у якіх у вас адчуваецца недахват, дык мы націснулі, дзе трэба было, у выніку чаго ўчора атрымалі афіцыяльнае паведамленьне нашага гандлёвага прадстаўніцтва ў Ізяне аб тым, што яшчэ 8 красавіка вам адпраўлены з-за мяжы сукна (10 мокрых для 1-га прэсу і 6 для другога).

Для сваячасовай дастаўкі ўсяго патрэбнага і ў далейшым трэстам будуць ужывацца самыя рашучыя меры.

За вынікамі вашага спаборніцтва будзем бязупынна і ўважліва сачыць, для чаго просьба да вас кожны тыдзень паведамляць нас аб разьмеры выпрацоўкі.

Кіраўнік Белпапертрэсту Якубсон.

Калектыў папярэджвае прагульшчыкаў

Віцебская фабрыка «Дзьвіна», адказваючы на выклік ільнапрадзільнай фабрыкі ім. Карла Маркса ў Высачанах (Віцебская акр.), падагуліла свае дасягненьні за апошнія гады.

Пачынаючы з студзеня, з кожным месяцам, **зьніжаецца лічба прагулаў і прастояў без грунтоўных прычын.** У студзені было 1⅓ проц. прагульных чалавека-дзён, цяпер—0,80 проц. Павялічваецца процант выпрацоўкі. У студзені процант выкананьня вытворчай праграмы вызначаўся ў 92,87 проц., у лютым—93,93 проц., у сакавіку—100,29 проц. Першыя 12 дзён красавіка далі новае павялічэньне—105,65 проц. Прадукцыйнасьць працы кожнага рабочага ў паасобку таксама дае добры малюнак. **У сьнежні выпрацоўка на кожнага рабочага выяўлялася ў 75 кілё-нумароў прадзіва, у студзені—павялічылася на 1,8 проц., у лютым дасягнула 77,06 і, нарэшце, сакавік даў новае д

МАКСЫМУМ УВАГІ ДРУГАРАДНАМУ ЭКСПАРТУ

Рынак другарадных экспартных тавараў у нас ахоплены дапёка яшчэ ня поўна — мы гэты экспарт маглі-б павялічыць у некалькі раз.

Трэба больш зацікавіць местачковае і вясковае насельніцтва ў зборы ануч, капытоў, рагоў, кясьцей.—Павялічэньне збору, акрамя паляпшэньня дабрабыту насельніцтва, будзе мець вынікам пашырэньне экспарту і тэмпу разьвіцьця прамысловасьці.

Конскі волас, як продукт экспарту

Аспоўнымі загатоўшчыкамі конскага воласу на беларускім рынку зьяўляюцца тры арганізацыі: Дзяржгандаль і сеткі спажывецкай і сельска-гаспадарчай кааперацыі.

Галоўнай бядой, якая перашкаджае пашырэньню экспарту конволасу, зьяўляецца не наладжанасьць як загатоўкі, так і пераапрацоўкі тэй часткі тавару, якая адпраўляецца за межы.

Прыёмчыкі часта нядбайна адносяцца да таго сорту, які яны прымаюць. Сартаваньне-ж не адпавядае тым стандартам, якія ўстанавіліся на замежных рынках.

У кніжцы «СССР на английском рынке», у артыкуле Этчэля гаворыцца наступнае: «На ангельскім рынку аргентынскі конскі волас прадаецца на 50 проц. даражэй рускага толькі дзякуючы таму, што ён добра адсартаваны, хаця па сваёй жорсткасьці ён ніжэй рускага воласу».

Галоўным рынкам збыту беларускага конскага воласу зьяўляецца Нямеччына і працаецца больш за ўсё на Лейпцыгскіх аўкцыёнах, адкуль ён ідзе як для нямецкіх шчотачных фабрык, так і для пераапрацоўкі ў другія краіны.

Спажыўцом нашага тавару зьяўляюцца шчотачныя прадпрыемствы Заходняй Эўропы і тут зьвяртае на сябе ўвагу тот факт, што тавар наш ідзе ня проста да спажыўца, а прахоліць яшчэ шмат пасярэднікаў, якія на сваіх сартавальнях пераапрацоўваюць наш тавар для спажыўцоў фабрыкантаў і саматужнікаў. Таму самай важнай задачай для паляпшэньня гэтай справы зьяўляецца арганізацыя і ў нас такіх прадпрыемстваў, каб не карыстацца больш такімі «добрымі паслугамі» нямецкіх дзяльцоў.

Акрамя карысьці ад такога тавару мы самі заработак нашы рабочым.

Пабудова такой сартавальні збыйдзецца зусім мала ў параўнаньні з тымі выгадамі, якія яна можа даць.

Хв. Корсікаў.

Шырэй разгарнуць другарадны экспарт

Яшчэ цэлы рад дробных і другарадных відаў экспарту ў нас, у БССР, не разгорнуты, як трэба. Рынкі яшчэ поўнасьцю не ахоплены. А між тым пытаньне аб узмацненьні другараднага экспарту, выдуманьні новых відаў зьяўляецца адным з важнейшых фактараў падняцьця экспарту, а разам з тым і разьвіцьця прамысловасьці.

Зараз, з надыходам вясны трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на загатоўку рознага віду рызьля, касьцей, рагоў, капытоў і г. д.

Нашы загатоўчыя арганізацыі, на жаль, яшчэ не разгарнулі шырока гэтых загатовак, яны часта, ганяючыся за першарадным таварамі, зусім забываюць пра «дробязі», якія могуць даць буйныя вынікі.

А між тым, да гэтай работы можна было прыцягнуць беспрацоўных, розныя грамадзкія арганізацыі, трэба выдаць папулярную літаратуру аб зборы рызьля, касьцей і г. д. Зразумела, абмежавацца толькі лістоўкамі, брашурамі—мала, тут патрэбна ініцыятыва, зацікаўленасьць, патрэбна непарыўная і настойлівая работа. Паводле даных, у Беларусі можна сабраць рызьля і касьцей у 5 раз больш, чым летась. Сельсаветы і РВК, нават акрэнгандлі на мясцох у гэтых адносінах нічога ня робяць.

Красавік—май—гэта самыя рашаючыя месяцы ў адносінах зборкі касьцей і ануч, і гэты час трэба скарыстаць, не абмінуўшы самага глухога кутка Беларусі.

Л. С—кі.

Кантрактацыя садавіны і гародніны павялічыць экспартны баланс

Загатоўкаю садавіны і гародніны для экспарту ў Беларусі пачалі цікавіцца толькі ў мінулым годзе. Вывозілі за граніцу яблыкі ў нязначнай колькасьці мы яшчэ гады два таму назад, але першая спроба пры адсутнасьці практыкі ў гэтай справе дала вельмі сумныя вынікі.

Разгарнулася гэта работа ў больш менш шырокім маштабе толькі ў 1927-1928 годзе, калі Белдзяржгандаль загатовіў і экспартаваў 1.487 тон яблык, але і гэта колькасьць складала толькі 74 процанты выкананьня пляну.

Лепш стаяла справа з цыбуляю, але і тут можна было больш інтэнсіўна разгарнуць як загатоўку, так і экспарт.

Для таго, каб паставіць справу экспарту садавіны і гародніны на цьвёрдую нагу, трэба выпукліць пытаньне аб кантрактацыі садавіны і гародніны.

Аб гэтай кантрактацыі летась неяк мала гаварылі, гэты шлях здаваўся многім рызыкоўным і нерэальным. Між тым, кантрактацыя—гэта адзін з найлепшых шляхоў для ўзмацненьня загатовак таго ці іншага тавару, бо апрача таго, што яна ўвязвае вытворцу з экспартэрам, яна дае магчымасьць уьздзейнічаць на вытворцу ў сэнсе правядзеньня агрыкультурных мерапрыемстваў.

Летась пры экспарце яблык было шмат нараканьняў па якасьць тавару з боку заграничных фірм. Ва ўмовах-жа кантрактацыі, пры сур'ёзных і ўдумлівых адносінах да справы, гэты важны дэфэкт можа быць лёгка зьнішчаны. Бо чым вышэй будзе якасьць закантрактаванага тавару, тым гэта карысьней для вытворцы.

Белдзяржгандаль ужо пачаў праводзіць у жыцьцё гэту работу, але яшчэ ня ў поўнай меры. Трэба падкрэсьліць, што саўгасы, сялянскія гаспадаркі ахвотна ідуць насустрач кантрактацыі яблык, цыбулі і іншых відаў садавіны і гародніны. Кааперацыя-ж, пад рознымі прычынамі, выкручваецца ад гэтае справы.

Трэба неадкладна пачаць поўным ходам работу па кантрактацыі садавіны і гародніны. Кантрактацыяй цыбулі трэба ахапіць мястэчкі, дзе местачковыя жыхары маглі-б шырока разгарнуць гэтую справу. Адначасова з цыбуляй трэба таксама закантрактаваць часнок.

Трэба адзначыць, што на замежных рынках, асабліва ў Англіі, наша цыбуля мае вялікі попыт. Такое-ж становішча мы маем і ў Нямеччыне, куды мы летась маглі экспартаваць у два разы больш, калі-б узмоцнена павялі загатоўку.

Л—кі.

Клясавыя ці касавыя інтарэсы

Аршанскі ЦРК павінен адмовіцца ад падтрыманьня клерыкалаў

ВОРША. (Наш кар.). Рабіны і папы актыўна рыхтуюцца да надыходзячага вялікадню—у сынагогах і касьцёлах клерыкалы агітуюць сярод веруючых, каб яны ўплывалі на сваіх дзяцей і прымусілі іх наведваць маліцьвеныя дамы ў «сьвятыя» дні.

Рыхтуюцца і бязбожнікі. Пленум Аршанскага акруговага савету бязбожнікаў зацьвердзіў плян антывялікоднай кампаніі і адзначыў, што трэба паглыбіць антырэлігійную агітацыю на вёсцы, дзе дзейнасьць бязбожнікаў разгорнута вельмі слаба.

Пленум адзначыў, што ў мінулым годзе былі выпадкі, калі Аршанскія савецкія і кааперацыйныя арганізацыі патуралі клерыкалам. Аршанскі ЦРК у мінулым годзе выдаваў спэцыяльныя пайкі да вялікадню, падтрымліваючы гэтым рэлігійныя абрады.

Рабочыя ст. Ворша вынесьлі пастанову не сьвяткаваць вялікадню, а праўленьне МБВ чыгункі сарвала гэтую ініцыятыву.

Трэба абвясьціць самую рашучую барацьбу з гэткімі зьявамі.

А.

Прадпрыемствы слаба падрыхтаваліся да будаўніцтва

ВІЦЕБСК (наш. кар.). Агульны кошт будаўнічых работ, якія намечаны ў сёлетнім годзе, з 10 мільёнаў руб. зьменшыўся да 8½. Такое скарачэньне будаўніцтва тлумачыцца галоўным чынам тым, што некаторыя прадпрыемствы своечасова не падрыхтаваліся да будаўнічага сэзону. Такія прадпрыемствы, як фабрыка абутку, шчацінны камбінат, элеватар маслазаводу, база рызьля Белдзяржгандлю і па гэты час не пасьпелі падрыхтавацца, і такім чынам будаўніцтва яшчэ больш пакароціцца.

Мясцовым будаўнічым матар'ялам галоўныя прадпрыемствы, уключаныя ў плян будаўніцтва, забясьпечаны. Не хапае толькі прызначанага матар'ялу, як жалеза і цэмэнт. Заяўкі на рабочую сілу ўсе арганізацыі зрабілі са значным спазьненьнем. Будзе не хапаць 450 кваліфікаваных рабочых, галоўным чынам арматурыстчыкаў, тынкаўшчыкоў, каменшчыкаў. Распачала працу тэхнічная нарада, на абгаварэньне якое ўнесена шмат прапаноў наконт паталненьня будаўніцтва.

Затрыманы бандыт Дзямідзенка

МАЗЫР. (Наш кар.). Затрыманы бандыт Дзямідзенка Яўдак, які паходзіць з вёскі Сапейкава, Азарыцкага раёну. Дзямідзенка мудады яшчэ хлапец, але ён пасьпеў ужо ўчыніць рад забойстваў.

Сьледчым органам выдалі бандыта Дзямідзенку яго бацькі.

Па Савецкай Беларусі

Падрыхтоўка батракоў на рабфакі

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У маі пры Віцебскім рабфаку Наркамасьветы адкрываецца 4-месячныя курсы на 60 чалавек, для падрыхтоўкі батракоў у рабфакі БССР. На курсы прымаюцца батракі, якія працавалі ў саўгасах на менш 2 год, або ў прыватных гаспадарцах на менш 5-ці год, на камандыроўках праўленьняў саюзу сельгаварабочых. У часе навучаньня на курсах батракі забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Зьезд саветаў Гомельшчыны

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Учора акруговы зьезд саветаў заслухаў даклад т. Баліцкага аб працы Ураду БССР. Па дакладзе выказалася 24 дэлегаты.

Пасьля заключнага слова т. Баліцкага з прывітаньнем зьезду выступіла дэлегацыя №-га палка. Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Новы вялікі калгас на Мазыршчыне

МАЗЫР. (Наш кар.). У Пятрыкаўскім раёне арганізуецца вялікі калгас на плошчы 1.000 гэктараў зямлі. У калгас уступае шмат бедняцкіх з ваколічных вёсак, якія падалі заявы аб арганізацыі гэтага калгасу. Гэтае вясны і ўвосень большая плошча ўсяе зямлі будзе засеяна.

2-га мая—Магілеўскі акр. зьезд саветаў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). 2-га мая склікаецца акруговы зьезд саветаў Магілеўшчыны. Зьезд абгаворыць справаздачу беларускага Ураду, справаздачу АВК, а таксама разгледзіць 5-гадовы плян разьвіцьця прамысловасьці і зямельныя справы. На зьезд мае прыехаць да 400 дэлегатаў.

Пабудова халадзільніку ў Магілеве

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Прэзыдыум АВК зацьвердзіў плян пабудовы халадзільніку ў Магілеве. Халадзільнік будзе наштаваць 600 тысяч рублёў. Пад пабудову адведзіцца ў раёне Лупалава пляц у 30 гэктараў.

Ёмкасьць халадзільніку разьлічана на 25 тысяч пудоў мяса з павялічэньнем яе паступова да 50 тысяч пудоў.

На халадзільніку ў першую чаргу захоўваюцца тыя прадукты, якія прызначаюцца для насельніцтва і хутка псуюцца, а таксама прадукты, што вывозяцца з межаў Магілеўшчыны.

Каб забясьпечыць хутчэйшы падвоз прадуктаў у горад, намечана правесьці чыгунку ад вакзалу да месца пабудовы халадзільніку.

Сталоўкі не здавальняюць попыту рабочых

Будаўніцтва новых сталовак адстае ад росту патрэбнасьці пайшчыкаў

ТРЭБА ПАШЫРЫЦЬ СЕТКУ РАБОЧЫХ СТАЛОВАК

У Менску патрэбна яшчэ адна сталоўка

Адным з самых балючых пытаньняў гарадзкога жыцьця зьяўляецца адсутнасьць належнай колькасьці сталовак у цэнтры гораду. Ня гледзячы на тое, што за апошні час адкрыліся яшчэ дзьве сталоўкі, усё-ж трэба сказаць, што попыт пайшчыкаў нездаволены. Рабочы за свой гадзінны абедзены перапынак ніяк ня можа пасьпець пайсьці ў сталоўку і там паабедаць. Паўгадзіны ён павінен прастаяць у чарзе пры касе, паўгадзіны мінімум ён чакае падачы абеду—вось гадзіна і прайшла.

Такім чынам, трэба адкрыць хаця-б яшчэ адну сталоўку ў цэнтры гораду.

Што-ж датычыць саміх абедаў, дык наглядаецца такія недахопы. Часта, калі падаюць абед, забываюць прынесьці відэльцы і нож. Вядома, што есьці пальцамі — некультурна. Абеды гатуюцца вельмі дрэнна. Мяса цьвёрдае, нясмачнае.

Часамі наглядаецца і такі малюнак. Заходзіць хто-небудзь у сталоўку, садзіцца каля століку, дастае з кішэні бутэльку «горкай», выпівае і закусвае цэрабкопаўскім хлебам. Ня толькі наведвальнікі, але нават і афіцыянты не зьвяртаюць на гэта ніякай увагі.

МІНОРНЫ.

Заводы патрабуюць гарачых абедаў

У Магілеве за апошні час усё больш павялічваецца попыт на абеды ў сталоўках ЦРК. Калі сталоўка № 1 раней адпускала 350-400 абедаў, дык цяпер яна адпускае звыш 500 абедаў. І трэба сказаць, што сталоўка не здавальняе ўсіх сваіх наведвальнікаў.

Аспоўная бяда—невялікае памяшканьне. Яно не дае магчымасьці пашырыць работу.

Апрача абслугоўваньня наведвальнікаў сталоўка № 1 развозіць у тэрмасах да 100 абедаў кожны дзень па заводах. І гэта не здавальняе рабочых. Яны патрабуюць ад сталоўкі, каб яна прывозіла ў два-тры разы больш.

Колькі каштуе цяганіна

Да аб'яднаньня заводаў «Метал», «Усход» і с.-г. майстэрань імя Бурбіса пры майстэрнях існавала сталоўка на 50-80 чалавек. Зараз, калі на тэрыторыі былога заводу «Метал» і майстэрань знаходзіцца адзін завод «Камунар» з лікам рабочых у 523 чал., існуе тая-ж самая сталоўка. Вядома, што яна ня можа задаволіць усіх рабочых.

Яшчэ пры перазаключэньні калдагавору рабочыя паставілі пытаньне аб пашырэньні сталоўкі да 1-га красавіка. Матываралі рабочыя тым, што ім прыходзіцца траціць шмат часу на чаргу за абедам. Рабочыя гаварылі, што для сталоўкі можна скарыстаць памяшкальне, якое зараз займае машынаспробная станцыя і якое знаходзіцца на тэрыторыі заводу.

Адміністрацыя заводу з гэтай прапановай згадзілася. І вось пачаліся перагаворы, якія цягнуцца да гэтага часу. Машынаспробная станцыя згодна аддаць памяшканьне, калі ёй дадуць іншае памяшканьне. Прычым машынаспробная станцыя пажадала атрымаць памяшканьне сталоўкі прафтэхшколы.

Яшчэ 18-га сьнежня мінулага году заводакіраўніцтва паслала дакладную запіску Белмэталятрэсту з просьбай паставіць гэтае пытаньне перад Эканомнарадай пры СНК. Два тыдні Мэталятрэст маўчаў. Тады заводакіраўніцтва 2-га студзеня паслала адносіну машынаспробнай станцыі, каб аднойняя заняла былое памяшканьне заводу «Усход». Машынаспробная станцыя згадзілася і пачала хадайнічаць перад гарсаветам аб перадачы ёй памяшканьня заводу «Ўсход». Зноў застукалі машынкі і пайшла пісаніна.

Прайшло два месяцы. Нарэшце, гарсавет пастанавіў: «памяшканьне былога заводу «Ўсход» замацаваць за працалектывам на вырабе лямпу, а па мяшканьне працалектыву перадаць машынаспробнай станцыі». Але бюракратам патрэбна цяганіна. Пастанова гарсавету ігнаруецца, працалектыў зацягвае свой пераход у былое памяшканьне заводу «Ўсход», машынаспробная станцыя ўсё яшчэ займае памяшканьне на заводзе, а рабочыя, як і раней, трацяць лішнія паўгадзіны на чаргу, чакаючы абеду. Кожны дзень гэта каштуе заводу 124 руб., а калі ўзяць патрачаны працоўны час з 18-га сьнежня да 1-га красавіка, дык у агульным ліку гэта складае каля 12.000 руб. Вось колькі пакуль што каштавана цяганіна.

Рабочыя патрабуюць хутчэйшага вызваленьня заводзкага памяшканьня і пашырэньня сталоўкі. Ужо пара спыніць злачынную страту працоўных гадзін.

Я. Коканаў.

Няма на чым працаваць

Больш увагі цэнтральнаму інстытуту працы!

За 3-х гадовае існаваньне ЦІП'у мы маем вялікія дасягненьні. Зараз ЦІП навучае каля 300 рабочых кваліфікацыі, з іх 42 токары па мэталю, 80 сьлясараў, 50 каваляў і 100 будаўнікоў. Пры ЦІП'е працуюць розныя гурткі, камісіі, выходзіць насьценгазэта, ёсьць бібліятэка і г. д. Перад і пасьля работы курсанты займаюцца па 15 хвілін фізкультурай. Кожны цэх, акрамя практычнай работы, вывучае і тэорыю работы свайго цэху.

Але ня ўсе ўсьвядомілі сабе ўсю важнасьць работы ЦІП'у. Асабліва датычыць гэта прафсаюзаў. Раскажам пра адзін цікавы момант. Калі культаддзел ЦСПСБ зьвярнуўся да ЦІП саюзаў з просьбай дапамагчы курсантам ЦІП'у ўзмацніць культработу і для гэтага адпусьціць хаця-б па 50 кап. на чалавека (члена данага саюзу), дык саюз харчавікоў замест грошай паслаў вучкому ЦІП'у такі адказ: «нашы члены саюзу харчавікі — усе культурныя, таму грошай мы не дамо». Такі-ж прыблізна адказ вучком атрымаў ад саюзу гарбароў. Але трэба адзначыць, што ня ўсе прафсаюзы так адносяцца да гэтай справы. Напрыклад, саюз нарсувязі адпусьціў па 2 р. 50 к. на кожнага курсанта, члена саюзу нарсувязі.

Такія адносіны да ЦІП'у прыводзяць да вельмі сумных вынікаў. ЦІП адчувае шмат патраб, якія нельга задаволіць з-за адсутнасьці грошай. У галіне культработы: рабкораўскі гурток існуе на паперы, гурток «Бязбожнік» працаваў толькі адзін раз. У бібліятэцы амаль няма кніг.

Такарны цэх павінен працаваць на паламаных варштатах. Увосень мінулага году прывезьлі 13 такарных варштатаў з Самары. Знадворны выгляд варштатаў быў надта добры. Але калі пачалі працаваць, дык высьветлілася, што ні адзін варштат ня годны: у адным шрубы паламаны, у другім розных частак не хапае, у трэцім часткі, якія павінны быць сталёвымі,—жалезныя і г. д.

Варштаты, якія былі выпісаны з Маскоўскага заводу «Пралетары», таксама нікуды ня годны. Запрошаны прадстаўнік Машынатрэсту для агляду варштатаў: нават не зьявіўся.

Плачуць варштаты, плачуць інструктары і курсанты, плачуць і грошы нашы. На варштатах-жа працаваць нельга.

Хто зьверне ўвагу на патрэбы ЦІП'у?

ЦФАСМАН.

У АКРУГАХ І РАЁНАХ МОГУЦЬ ПРАСПАЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ ПАСЕВАЎ

АГРАНОМІ ДЗЕЛАВОД

Аграномы сядзяць у канцылярыях і трацяць 90 проц. свайго часу на канцылярскую работу райвыканкомаў

На старонках «Зьвязды» мы ўжо нядаўна наведамлялі аб умовах працы беларускіх аграномаў. Мы пісалі, што ва многіх мясцох раённая ўлада ня толькі ня робіць нічога, каб выканаць дырэктыву ўраду аб стварэньні спрыяючых умоў для работы аграномаў, а нават робіць усялякія перашкоды ў іх рабоце. Сёньня мы зноў павінны вярнуцца да гэтага пытаньня, каб прыкаваць да яго ўвагу ўсёй вясковай грамадзкасьці, бо ад пасьпяховай работы агранома шмат у чым залежыць своечасовая і належная падрыхтоўка да сяўбы і ўся справа правядзеньня дырэктыў партыі і ўраду аб узьнаўленьні ўраджайнасьці. Таму мы сёньня зноў зьмяшчаем ліст агранома з Пухавіцкага раёну. Вось што ён піша:

***

Дырэктывы ўраду аб стварэньні найбольш спрыяючых умоў для работы агранамі і ў прыватнасьці аб разгрузцы агранома ад канцылярычны да Пухавіцкага РВК чамусьці не датычацца. Пухавіцкі райаграном замест жывой практычнай работы, замест жывога кіраўніцтва аградапамогай у раёне прымушан быць дзеловодам земчасткі РВК. За апошнія 3 гады работы ў раёне яшчэ ніколі ня было такой канцылярскай нагрузкі аграному, як у гэтым годзе. Уся канцылярская работа па ўсіх галінах сельскае гаспадаркі выконваецца выключна райаграномам аж да падшыўкі папер. 90 проц. усяго часу траціцца на канцылярскую работу. Калі ня лічыць дапамогі машыністкі, якой чамусьці трэба абанязкова дыктаваць, аграном больш ніякай дапамогі з боку тэхнічнага апарату РВК не атрымлівае. Але ўсё гэта нічога, калі было-б хоць месца для работы. А то прыходзіцца бегаць ал стала да стала, каб дзе-небудзь прытуліцца. Няма таксама месца і для хаваньня папер і спраў. Прыехаўшы з раёну, прыходзіцца доўга шукаць, пакуль пазьбіраеш усе паперы.

Усё гэта адбываецца ў той час, калі агранома чакае калтас, вытворчы каапэратыў, вёска, пасёлак і наогул чакае жывая вытворчая агранамічная работа. Гэта ў той час, калі, як кажуць, кожнае слова агранома варта пуду хлеба. А аграном запрэжан у хамут канцылярычны і выконвае тую работу, якую з посьпехам мог-бы выканаць любы тэхнічны працаўнік РВК.

Л. РАЎДО.

***

Наколькі нам вядома, такія ўмовы работы для аграномаў існуюць ня толькі ў адным Пухавіцкім раёне. На мясцох да гэтага часу яшчэ ня ўцямілі сабе, што ўжо пара вызваліць агранома ад паперак і даць яму магчымасьць працаваць па сваёй спэцыяльнасьці, усклаўшы канцылярскую работу на любога супрацоўніка. Вясковая грамадзкасьць павінна зьвярнуць увагу на гэту справу. Раённыя партарганізацыі ў сваю чаргу павінны зрабіць усё, каб стварыць належныя ўмовы для пасьпяховай работы аграномаў.

Б.

За апошні час прыводзяцца даныя аб недахопах у справе правядзеньня кантрактацыі гэтага году. Асабліва нападаюць акруговыя ўстановы на цэнтральныя органы і ў прыватнасьці на Белсельсаюз. Скардзяцца, што несваячасова атрымліваюць дагавары з пасеўшчыкамі, скардзяцца па зьмены плошчаў, што кантрактуюцца і наогул на частыя зьмены па кантрактацыі ў сэнсе прынцыповых установак.

Нам пажадана было-б падаць некаторыя матар'ялы па гэтым пытаньні, якія-б высьветлілі фактычнае становішча кантрактацыі і дзе і як нам патрэбна выпраўляць свае памылкі.

Па асноўных культурах, як збожжавых (гатункові авёс і ячмень), і тэхнічных (лён, канаплі), дагавары былі высланы на месцы ў сярэдзіне лютага; па бульбе і насенных культурах дагавары былі высланы ў пачатку сакавіка. Ніякіх зьмен па ўсіх культурах, акрамя плошчаў па канаплях, мы фактычна ня мелі. І на мясцох было даволі часу для таго, каб своечасова пасьля растлумачальнай кампаніі па кантрактацыі прыступіць да фактычнага заключэньня дагавароў з пасеўшчыкамі.

Паглядзім, якія мы маем даныя абсьледаваньня правядзеньня кантрактацыі акруговымі саюзамі, накіраваньня дагавароў у нізоўкі і пачатку заключэньня іх з пасеўшчыкамі.

У Гомель дагавары на лён накіраваны 20 лютага, а нізоўцы акруговы саюз пасылае іх каля 10-га сакавіка. У некаторых таварыствах да гэтага часу няма дагавароў на збожжавыя і тэхнічныя культуры, а таксама няма кніг па кантрактацыі, якія былі накіраваны Белсельсаюзам яшчэ ў лютым месяцы. Мы ўпэўнены, што такое зьявішча мы маем і па іншых акругах.

А калі-ж пачалася фактычная праца па кантрактацыі ў сэнсе афармленьня і заключэньня дагавароў з пасеўшчыкамі па мясцох? На гэта мы маем такі адказ: толькі ў красавіку месяцы.

Што тармазіла пачаць гэту працу значна раней? Няма ніякага сумненьня, што гэта залежала выключна ад таго, што нізоўка да гэтага часу не разгарнула працы па кантрактацыі з прычыны таго, што яна загружана цэлым радам іншых заданьняў, зьвязаных з пасеўкампаніяй (збор пратэрмінован і г. д.), а непасрэдную працу па ўсіх галінах праводзіць у большасьці адзін старшыня таварыства, не атрымліваючы падтрыманьня і дапамогі ад мясцовых партыйных і савецкіх органаў і каапэрацыйнага актыву.

Пры абсьледваньні становішча кантрактацыі ў Чавускім раёне, Магілеўскай акругі, ва Уваравіцкім і Буда-Кашалеўскім раёнах, Гомельскай акругі, выяўлена, што да гэтага часу таварыствамі сяк-так праведзена растлумачальная кампанія. А далей таварыствы... чакаюць, пакуль дзядзькі прыдуць да іх заключыць дагавор, у той час, калі ў гэтым годзе ўзяты курс на заключэньне групавых дагавароў з цэлымі вёскамі і населішчамі. Посьпех гэтай працы можа быць забясьпечаны толькі шляхам выездаў на вёску, а не сядзеньнем у таварыстве і іншых установах і органах, якія павінны вылучыць усе сілы на вёску для жывой прадукцыйнай работы па правядзеньні сяўбы і кантрактацыі сярод сялянства ў самой вёсцы.

Да 1-га мая застаецца толькі 13 дзён і да гэтага моманту трэба выканаць заданьне па кантрактацыі. Гэта магчыма толькі пры поўным напружаньні ўсіх мясцовых сіл, а на толькі аднаго старшыні таварыства. Акруговым саюзам трэба таксама аддаць максымум увагі гэтаму пытаньню і ўсім трэба памятаць, што кантрактацыя ёсьць самая адказная палітычная і эканамічная справа ў веснавую пасеўкампанію.

Безадкладна павінны быць выпраўлены і знішчаны ўсе памылкі, якія былі зроблены на мясцох.

Як прыклад недапушчальнай памылкі, можна паказаць на Магілеўскую акругу, дзе ўзята ўстаноўка на кантрактацыю не таварных лішкаў, а ўсёй пасеўнай плошчы, што яўна супярэчыць даным дырэктывам цэнтральных органаў, Белсельсаюзу і зьявілася прычынай невыкананьня збору закантрактаванай прадукцыі лёташняй кантрактацыі. Тое-ж самае і па Віцебскай акрузе.

У сучасны момант цікавіцца працай кантрактацыі і дапамагаць павінны ўсе савецкія і партыйныя органы. Праз кантрактацыю мы павінны рэалізаваць дакрэт ураду аб павышэньні ўраджайнасьці і тыя казёныя і фармальныя адносіны, якія мы маем у сучасны момант да гэтай працы з боку райвыканкомаў, сельсаветаў і іншых установаў, у далейшым не павінна паўтарацца.

Усе партыйныя, савецкія арганізацыі і грамадзкасьць абавязаны сачыць ня толькі за колькасным, але і за якасным выкананьнем кантрактацыі, каб закантрактаваная прадукцыя паступіла ад пасеўшчыкоў поўнасьцю ка ўсе сто процантаў, а гэтага мы дасягнем тады, калі ўважліва і правільна выканаем нашы задачы па кантрактацыі ў гэтым годзе і надамо ёй грамадзкі і палітычны сэнс пры выкананьні практычнай работы на мясцох.

А. Дубіна.

ТВАР КЛЯСАВАГА ВОРАГА

З крыжам і бомбаю супроць рэвалюцыі

Выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнае абшчыны іянітаў на Украіне

У СЭКТАНТАЎ ЗНОЙДЗЕНА ЗАКАПАНАЯ ЗБРОЯ

Надаўна ў нашых газэтах паведамлялася аб раскрыцьці контр-рэвалюцыйнага гнязда, якое шмат галоў арудавала на Украіне пад маскаю абшчыны іянітаў. Для выкрыцьця твару сэктантаў, якія прыкідваліся часта прыяцелямі савецкае ўлады, раскажам больш падрабязна.

«АБШЧЫНА ДЗЕВЫ МАРЫІ» І ХТО ПАД ЁЮ ХАВАЎСЯ

Праслынуты Іоан Кранштадзкі быў адным з арганізатараў «Саюзу рускага народу», цэнтральнай фігурай рэакцыйнага «мракобесия» пры царызьме.

Сярод купецтва, кулацтва на сяле і мяшчанскіх пластоў гораду Іоан Кранштадзкі карыстаўся выключнай папулярнасьцю. Стварылася спэцыяльная сэкта іянітаў, якая лічыла Іоана Кранштадзкага цудатворцам.

У 1913 годзе такая абшчына іянітаў, навербаваная з ліку сельскіх багатыроў, стварылася ў Межаўскім раёне (Капярынаслаўшчына) пад боскай назвай «Абшчына імя сьвятое дзевы Марыі». Абшчына гэта хутка абярнулася ў сапраўдную цыгадэль манархізму на сяле, праводзячы барацьбу з рэвалюцыйным рухам у сялянстве.

МАНАСТЫР—КРЭПАСЬЦЬ

Гэта абшчына існавала і, зразумела, ня спыняла сваёй дзейнасьці і пры савецкай уладзе.

На працягу ўсёй грамадзянскай вайны, марынская сэкстанцкая «камуна» вяўлялася штабам усіх банд, што апэравалі ў гэтым раёне. У «камуне» ў якасьці пажаданых гасьцей перабывалі Махно, Шчусь, Ванькін і больш дробныя атаманы разам са сваімі бандамі. Абшчына забясьпечвала банды фуражом, бялізнай. Прыход банды быў сьвятам для ўсяе абшчыны.

Самы манастыр прадстаўляў сабою падрыхтаваную да ўзброенага нападу і адпору крэпасьць.

Ня дзіва таму, што калі ў 1921 годзе прыхільніка іянітаў, атамана Бойка, разьбілі чырвоныя, сэктанты парашылі ліквідаваць довады сваёй узброенай барацьбы з бальшавікамі. Зброю закапалі на старых могілках, змазаўшы не і начысьцільшы. Гранаты закруцілі ў вопуну. Загадчык зброяй, Цыганок, прыходзіў на могілкі штогод і змазваў зброю. У любую хвіліну гэта зброя магла быць зноў накіравана супроць рэвалюцыі.

Нядаўна быў адкрыт гэты арсэнал сэктантаў. У вямлі, глыбінёю ў 2 мэтры, выкрыта было 10 стрэльбаў да 1.400 патронаў, 17 бомб, порах, шаблі, рэвальвэры...

«СЬВЯТАЯ МАМА»—«БАГАРОДЗІЦА» КАРГАЧОВА І ЯЕ МІНІСТРЫ

На чале ўсёй гэтай іяніцкай абшчыны стаяла вядомая «багародзіца» Кацярына Каргачова, прыхільніца і дапаможніца «самога» Іоана Кранштадзкага. Яна панавала ў ёй, як паменчыца, дэспатычна распараджаючыся ўсімі членамі абшчыны. Усе кіраўніцтва абшчынаю было разьмеркавана паміж прысьпешнікамі «сьвятой мамы», як па міністэрствах.

На сакрэтных сходах штабу чорнасоценцаў было пастаноўлена не дапушчаць у абшчыну духу бальшавізму, тыкжа, хто ўспрыймае гэты дух, лупцаваць лазою (!) і выганяць з абшчыны. Пастанова выконвалася жорстка.

Лаза была выпрабаваным сродкам да непакорных. Лупцавалі ня толькі моладзь і дзяцей, але і дарослых, нават жанчын. Гэта кара была звычайнай зьявай у «камуне». Самая пазначная правіннасьць—кладзіся. Пасьля прыходу савецкае ўлады ў 1920 г. «мама» высекла «для острастки» ўсю абшчыну, 250 і больш чалавек!

КАЛІ «ЦАРСТВІЮ БОЖЫЮ» ПРЫШОЎ КАНЕЦ

У 1924 годзе «сьвяты» ераманах Амвросі, правая рука багародзіцы, у часе служэньня агаласіў анафэму савецкай уладзе.

Гэтым выступленьнем характарызуюцца ўсе адносіны іяніцкай абшчыны да рэвалюцыі. Ад нішчырыгтай барацьбы абшчына ў наступныя гады перайшла да эканамічнага падрыву мерапрыемстваў савецкае ўлады і манархічнай прапаганды.

У 1921 г., у гады голаду, іяністыя закапалі ў вямлю, каб не аддаваць галадаўцам, 20.000 пуд. збожжа. Увесь хутар быў закапаны на патайныя ямы, у ліку каля 30, дасканала зробленых згодна ўсіх правіл інжынэрна-сапёрнае тэхнікі. Збожжа ў гэтых ямах хавалася амаль да апошняга часу.

Адну з ям нядаўна ўдалося выкрыць. Там аказалася 12 тон ячменю, зусім годнага для сяўбы або перамолу.

Зараз 18 чал., найбольш заядлых чорнасеценцаў, контр-рэвалюцыянэраў арыштаваны.

Былое гняздо чорнасоценцаў будзе вынішчана.

Н. В.

Наблізіць ашчадныя касы да сэзонных рабочых

Разгортваньне будаўнічых работ і значны прыток у сувязі з гэтым сэзонных рабочых высоўвае пытаньне аб прыняцьці ўсіх мер да належнага іх абслугоўваньня і вядзеньня масавай культасьветнай працы.

Сярод мерапрыемстваў, якія трэба правесьці у гэтым напрамку, асабліва увагі заслугоўвае ўкараненьне ў быт сэзонных рабочых ідэй ашчаднасьці. Усім вядома, што сярод гэтых кадраў рабочых шырока разьвіта п'янства і іншыя адмоўныя зьявішчы. Гэтаму спрыяюць умовы, у якіх жыве большасьць сэзонных рабочых.

Між тым, як паказвае практыка мінулых гадоў, у галіне ўцягненьня сэзонных рабочых у ашчадныя касы амаль што нічога ня было зроблена.

Аспоўнай прычынай гэтага зьявішча трэба лічыць пасыўныя адносіны да ашчаднай справы перажнай часткі саюзных органаў і гаспадарча-будаўнічых арганізацый. Часткова віна ляжыць і на ашчадным апараце, які не заўсёды прымаў належныя практычныя меры да абслугоўваньня сэзонных рабочых.

У гэтым будаўнічым сэзоне павінны быць прыняты ўсе меры, каб унікнуць ранейшых памылак і правесьці рад мерапрыемстваў, якія забясьпечвалі-б сапраўдны абхап ашчадкасамі сэзонных рабочых.

Прэзыдыум Цэнтральнага Праўленьня саюзу рабочых будаўнікоў даў рад дырэктыў акруговым аддзяленьням, належныя паказаньні даны і па лініі ашчадных кас і будаўнічых арганізацый.

Зараз слова за месцамі, якія павінны гэтыя дырэктывы правесьці ў жыцьцё.

У мясцох, дзе будзе сканцентравана значная колькасьць рабочых-будаўнікоў, трэба адкрыць ашчадныя касы, прычым апошнія павінны быць пастаўлены ва ўмовы, якія забясьпечвалі-б нармальную іх працу і былі-б прыстасаваны да здавальненьня патрэб сэзоньнікаў.

У мясцох з менш значнай колькасьцю рабочых трэба ўстанавіць іншыя формы абслугоўваньня (вылучэньне ўпаўнаважаных, наведваньне працаўнікамі ашчадкасы пабудоў у вызначаныя дні і г. д.).

Калі прыняць пад увагу, што ў надыходзячы сэзон па БССР у буда

Час заняцца вярбоўкай у вайсковыя школы

На мясцох яшчэ сьпяць

Учора на пасяджэньні цэнтральнай камісіі па вярбоўцы ў вайсковыя школы пры ЦВК БССР быў заслуханы даклад Менскай акруговай вярбовачнай камісіі. Камісія дала дырэктывы мясцовым, але яна нічога на ведае, што робіцца ў адносінах вярбоўкі на прадпрыемствах і ў раёнах. Між тым, папулярызацыя вярбоўкі сярод мас рабочых, батраноў, бедняноў і чырвонаармейцаў праводзіцца надзвычайна слаба.

Цэнтральныя праўленьні саюзаў таксама далі дырэктывы і на гэтым паставілі крапку.

Цэнтральная камісія нечакані раз ставіла пытаньне аб арганізацыі вечару рабочай моладзі, прысьвечанага вярбоўцы, але да гэтага часу, на гледзячы на прапановы ЦК ЛКСМБ, вечар не арганізаваны. Прычыны знаходзяцца—камсамольскія арганізацыі перагружаны бягучымі кампаніямі—прамысловым находам, абмерам попелу і інш.

Па вестках камісіі, кампанія па вярбоўцы па Магілёўскай акрузе зусім не разгорнута.

Цікава ведаць, як абстаіць справа ў Гомельскай і Бабруйскай акругах. С.

Курсы для падрыхтоўкі кандыдатаў у вайсковыя школы

Цэнтральная камісія па вярбоўцы ў вайсковыя школы пастававіла арганізаваць 3-хмесячныя курсы для падрыхтоўкі кандыдатаў у вайсковыя школы СССР з рабочых, батраноў і бедняноў Беларусі. Курсы разьлічаны на 80 ч.

СНК БССР адпускае на арганізацыю курсаў 2.000 руб., Асоавіяхім—1.000 р. і прафарганізацыі—1.000 руб.

Цэнтральная камісія зьняла перад ЦВК БССР хадайніцтва, каб за рабочымі, якія пасланы на падрыхтоўчыя курсы і па розных прычынах ня прыняты ў вайсковыя школы, захоўвалася іх ранейшая пасада на прадпрыемстве.

Перад новым прыёмам у ВНУ

Правілы прыёму—на шыр окае грамадзкае абгаварэньне

Падыходзіць час, калі мы навінны, як чарадзячы, распачаць падрыхтоўку да набору ў нашы ВНУ, тэхнікумы, рабфакі, прафшколы і іншыя навучальныя установы.

Улічваючы памылкі пры прыёмах у навучальныя ўстановы ў мінулым годзе, нам трэба сёлета уперш-на-перш на заводзе, фабрыцы, у сельсавеце абгадумачыць, як і куды кожны работны, батрак і бяднейшы селянін можа паступіць вучыцца, трэба даць яму параду, у якую школу ён больш за ўсё падыходзіць і як яму туды паступіць.

Сёлета нам трэба абсалютна адмовіцца ад ўсякіх дадатковых залічэньняў у навучальныя ўстановы паміма прыёмавых камісій, а калі і дапускаюцца яно, то толькі выключна з мэтаю павялічэньня партыйна-пралетарскага складу прынятых, а не за кошт жонак, пляменьніц спецыялістых і інш.

У часе прыёму трэба пільна сачыць за тым, каб пад відам рабочага альбо селяніна ў нашы школы не пралез варожы элемэнт-нэпман, кулак, гандляр і інш. За няправільныя спраўкі аб сацыяльным становішчы паступаючых вінаватых трэба аддаваць пад суд.

Каб лепш падрыхтавацца да прыёму, я лічу парадак і правілы прыёму ў нашы ВНУ і іншыя навучальныя ўстановы абмеркаваць ня толькі ў сьценах НКА, а вынесьці на шырокае грамадзкае абгаварэньне, на партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя нарады з удзелам шырокіх мас рабочых і рабочай моладзі—такая нарада дасьць шмат каштоўных прапаноў, як лепш правесьці набор у наступным навучальным годзе.

Камсамольскія арганізацыі павінны зараз-жа адабраць лепшую частку маладых рабочых, батраноў, жадаючых вучыцца і дапамагчы ім паступіць у нашы навучальныя ўстановы.

Ганцэвіч.

Двухтыднёвік ашчаднасьці

На адных пастановах далёка не заедзеш

«Двухтыднёвік ашчаднасьці», што зараз праводзіцца, ня даў яшчэ нам тых вынікаў, якіх мы чакалі ад яго, бо наша грамадзкасьць, асабліва прафсаюзныя арганізацыі ня прымаюць у ім належнага ўдзелу. Яны лічаць выстарчальным заслугаць даклад і прыняць тую ці іншую пастанову.

І толькі. За красавік праведзена па горадзе шмат сходаў саюзаў, дзе былі прынятыя пастановы аб тым, што ўсе члены саюзаў павінны быць укладчыкамі ашчадных кас. Ці праверылі нізавыя праф'ячэйкі, як выконваюцца пастановы агульных сходаў. Можна з упэўненасьцю сказаць, што не.

Зараз вышэйшыя прафесіянальныя арганізацыі ў асобе ЦП саюзаў павінны на пасяджэньнях прэзыдыумаў заслухаць справаздачы фабзаўмясцкомаў аб выніках кампаніі і гэтым дабіцца выкананьня задач, пастаўленых перад ашчаднымі касамі.

Л. Гурэвіч.

Замест жывое справы—адпіска

У галоўную ашчадную касу паступіў ліст ад аднаго селяніна Уваравіцкага раёну з просьбай растлумачыць значэньне ашчадных кас. Галоўная каса, паслаўшы селяніну адказ, адначасова прапанавала мясцовай ашчаднай касе ва Ўваравічах прыцягнуць гэтага селяніна да папулярызацыі ашчаднай справы.

Замест таго, каб гэта зрабіць, Уваравіцкая каса пры паштова-тэлеграфн. аддзяленьні прыслала доўгі ліст, што, быццам, усе справы ведаюць аб значэньні ашчадкас, што ўсё абстаіць добра.

На справе, аднак, далёка ня так. Але-ж каса не пажадала скарыстаць гэты выпадак, а парашыла лепш абмежавацца «адпіскай».

П.

Пачалася генэральная праверка падрыхтоўкі да сяўбы

У сувязі з пастановай апошняга пленуму ЦК КП(б)Б правесьці генэральнае абсьледваньне падрыхтаванасьці БССР да веснавой сяўбы, калегія НКЗБ на апошнім сваім пасяджэньні, дакладна абмеркаваўшы гэтае пытаньне, парашыла ажыцьцявіць наступныя практычныя мерапрыемствы. Генэральная праверка павінна зараз-жа пачацца па ўсёй лініі, прычым праверка па лініі цэнтральных і акруговых установаў павінна скончыцца да 20 красавіка, а па лініі раёнаў і сельсаветаў—да 1-га мая.

Сёньня пачалася генэральная праверка выкананьня дырэктыў аб падрыхтоўцы да сяўбы цэнтральнымі ўстановамі ў Менску: Наркамземам, Калгассаюзам, Белсельсаюзам і г. д. У праверцы прымаюць удзел супрацоўнікі НК РСІ.

Сёньня-ж з Менску ў акругі і раёны выяжджае звыш 20 адказных працаўнікоў цэнтральных органаў для праверкі і кіраўніцтва праверкай на мясцох. З гэтай-жа мэтай выяжджае і старшыня Белсельсаюзу т. Дубіна.

Праверка вядзецца па пэўнай праграме. Задачай праверкі зьяўляецца ня толькі выяўленьне недахопаў падрыхтаванасьці, а і тэрміновая ліквідацыя недахопаў.

Перавыбары спажывецкіх таварыстваў

Здаровы падыход да справы

(МАЗЫР)

Па нашай акрузе заканчваюцца перавыбары спажывецкіх таварыстваў, перад якімі адбываліся сходы пайшчыкаў па выбарах упоўнаважаных (такіх сходаў было праведзена 166). Калі яўка пайшчыкаў на гэтыя сходы была ня вельмі значная (зьявілася на сходы 52 проц. агульнага ліку пайшчыкаў), затое значна павялічылася колькасьць жанчын на гэтых сходах (жанчыны складалі 54 проц. да агульнага ліку пайшчыкаў-жанчын).

Значна большая яўка была на сходах упоўнаважаных (зьявілася 83 проц. да агульнага ліку упоўнаважаных). Характэрнай рысай у сучаснай перавыбарчай кампаніі спажывецкай каапэрацыі зьяўляецца значна ўзросшая актыўнасьць пайшчыкаў (на справаздачна-перавыбарчых сходах было задана 2.640 запытаньняў і выступіла ў спрэчках 1.336 чал.).

На сходах можна было чуць здаровыя і дзелавыя выступленьні пайшчыкаў. Вось некалькі прыкладаў. На сходзе упоўнаважаных у в. Курычыны (Петрыкаўскага раёну) сход пастанавіў выключыць 2-х, выпадкова праслезных у склад упоўнаважаных, «былых» людзей з цёмным мінулым. У цэлым радзе месц пайшчыкі патрабавалі спыненьня водпуску тавараў тым сялянам, якія свой хлеб прадаюць выключна прыватнікам. Патрабавалі таксама прыняцьця больш рашучых мер пакараньня за растрату.

У склад нанава абраных праўленьняў партыйцы і камсамольцы складаюць больш 40 проц., жанчыны складаюць 22,1 проц.

Б. Ш.

Далі адпор кулаком

(Грэскі раён, Менскай акругі)

Тая жорсткая клясавая барацьба, што адбываецца на вёсцы, вызвалася ня толькі пры перавыбарах саветаў. Яна з ня меншай сілай праяўляецца ў кампаніі па перавыбарах спажывецкай каапэрацыі, што зараз праходзіць.

Кулак, атрымаўшы рашучы адпор пры перавыбарах саветаў, імкнецца папраўіць сваю няўдачу на перавыбарах кіруючых органаў спажывецкай каапэрацыі. Нядаўна ў нашым раёне праходзілі перавыбары праўленьня апалінскага спажывецкага таварыства. Раён дзейнасьці апалінскай спажывецкай каапэрацыі абхапляе сельсаветы з буйнейшымі гаспадарамі ва ўсім раёне.

Група заможнікаў прайшла ў якасьці ўпоўнаважаных спажывецкага таварыства. На перавыбарчым сходзе ўпоўнаважаных, гэта група энэргічна выступіла супроць дыфэрэнцыраванага паю, супроць кандыдатур, рэкамэндаваных парт'ячэйкай у склад праўленьня.

Заможнікі напаілі некалькіх сераднякоў, якія разам з імі выступалі супроць упоўнаважаных беднякоў. Але бедната і серадняк арганізавана выступілі супроць заможных падкулачнікаў.

Кулаком выгодна, каб каапэрацыя прадавала дрэнна, яны ня хочуць дыфэрэнцыраванага паю, бо гэта ім ударыць на кішэні, нам трэба згуртаваць навакол каапэрацыі, бо гэта наша родная арганізацыя, якая дапамагае нам—быў адказ беднякоў і сераднякоў на выступленьні заможнікаў.

У выніку галасаваньня заможнікі праваліліся з трэскам. Сход пастанавіў перайсьці на дыфэрэнцыраваны пай.

ЭМСНІ.

Удзел жанчын у перавыбарчай кампаніі

(Меншчына)

Справаздачна-перавыбарчая кампанія каапэрацыі ў самым разгары.

Вось папярэднія вынікі ўдзелу жанчын у справаздачна-перавыбарчай кампаніі на Меншчыне.

Па 30 спажывецкіх таварыствах праведзена 295 сходаў, на якіх прысутнічала звыш 65 проц. агульнага ліку жанчын-пайшчыкаў.

Па падрыхтоўчай працы праведзена 5 раённых канфэрэнцый жаночага каапактыву, спэцыяльных сходаў жанчын—50, на якіх прымала ўдзел 1.126 жанчын.

Абрана ўпоўнаважаных-жанчын 204—8,2 проц. супроць 5,8 проц. у мінулым годзе. Удзел жанчын-упоўнаважаных на перавыбарчых сходах—91 проц.

У праўленьні абрана 6 жанчын—19,3 проц. (у мінулым годзе 5,4 проц.), якіх 1 старшыня праўленьня і 1 намеснік старшыні—жанчыны.

У рэвізійныя камісіі абрана 16 жанчын—9,2 проц. (у мінулым годзе—3,7).

Гэтыя лічбы гавораць вырэзна за тое, што жанчына ў спажывецкай каапэрацыі займае належнае месца. Але гэта яшчэ невыстарчальна, трэба і ніяк спажывецкім таварыствам павялічыць колькасьць жанчын у выбарчых органах каапэрацыі, зьвярнуўшы ўвагу на ўтаўленьне жанчын бяднячак і батрачак.

СЫМОНЧЫК.

МЕНСК

700.000 р. на ахову працы

Наркампрацы да сучаснага моманту заключыў дагаворы на мерапрыемствы па ахове працы з усімі трастамі за выключэньнем Белпалертрэсту, шклотрэсту і Белшчаціны. Усяго заключана дагавораў на суму каля 700.000 р. Распачата падрыхтоўчая праца па складаньні заявак і заключэньні дагавораў на будучы гаспадарчы год.

Адкрыцьцё летняга дому адпачынку

Летні дом адпачынку ў Ждановічах адкрыецца 16 мая. Штомесячна праз яго будзе прапушчана 700 чал. Абсталяваны дзіцячы пакой на 10 ложкаў.

Усе месцы разьмеркаваны па саюзах.

Роспуск прафкому агратэхнікуму

Старшыня ЦБ пралетотуду т. Башмачнікаў абсьледваў работу прафкомаў Рагачэўскага Белпедтэхнікуму і Чырвонаармейскага агратэхнікуму. Выяўлена поўнае разлажэньне студэнцкай арганізацыі прафкому, п'янка і наогул паслабленьне работы прафкому. Прафком распушчаны. За старшыню новага прафкому абрана студэнтка агратэхнікуму т. Благавесьнікава.

Новая студэнцкая часопісь

З 15 мая ў Менску пачне выходзіць новая штомесячная часопісь «Чырвоны студэнт»—орган ЦБ пралетотуду Бел. Часопісь будзе выдавацца па тыпе масковскае студэнцкае часопісі «Красное студенчество».

Т. Рэзніка—работніца, вылучаная на пасаду пам. пранурора Менскай акругі

1.000 батракоў у школы

Саюз сельгаслесрабочых паставіў сабе задачу ў гэтым годзе паслаць тысячу батракоў у школы, рабфакі, тэхнікумы і ВНУ. Месцам дана дырэктыва падрыхтаваць 160 кандыдатаў для пасылкі ў рабфакі, 200—у тэхнікумы, 60 у вайсковыя школы, 200—у ВНУ і 100 батракоў—на доўгатэрміновыя курсы. 25 проц. месц вызначаецца для батрачак.

Падтрымліваюць п'яніц

У той час, як увесь наш друк, уся грамадзкасьць ва ўсю шырыню паставілі пытаньне аб барацьбе з п'янствам і прагуламі, адміністрацыя Аварацкага лесазаводу і заўком (Талачынчына) яшчэ да гэтай работы не прыступілі, ня гледзячы на тое, што прагулаў на заводзе ёсьць шмат. Так, напрыклад, рабочыя Тарашкевіч і Калясінскі п'янствуюць, 2-3 дні пасьля атрыманьня пэнсіі не зьяўляюцца на работу, а адміністрацыя і заўком ніякіх мер ня прымаюць, ня гледзячы на тое, што пра іх ужо многа пісалася і ў пасьдзедзяцтве. Трэба адміністрацыі больш строга ўзяцца за гэтую справу.

В. К.

Пашыраецца выраб будаўнічых матар'ялаў

Сёлета саматужныя арцелі па вырабе будаўнічых матар'ялаў вызваляюцца ад уплаты арэнды за кар'еры і дзялянкі зямлі, вызначаныя для здабываньня гліны і вапны. Для фінансаваньня саматужных арцеляў Белсельбанк вызначыў крэдыт ў 25.000 р. Узьнята пытаньне аб водпуску для гэтай жа мэты 150.000 руб.

Зьніжэньне цэн на плугі

Эканомнарада запрапанавала Белматалётрэсту зьніжыць адпускныя цэны на плугі па 50 к. на штуку. Наркамгандлю даручана распрацаваць пытаньне аб далейшым зьніжэньні цэн на плугі гандлёвымі арганізацыямі.

Завочныя навучальныя ўстановы

Аднаўляе сваю работу завочны пэдфак БДУ. Згодна пастановы калегіі Наркамасьветы заявы для паступленьня на завочны пэдфак будуць прымацца з 1 мая па 1 чэрвеня.

Вылучана камісія для прыёму заяў на завочны рабфак. Ужо падана каля 100 заяў. Залікі за першы курс рабфаку будуць прымацца ў студзені.

Пабудуем самалёт і танк

Рэдкалегія насьценгазэты фанэрнай ф-кі «Чырвоны Кастрычнік» (Мазыр) ад імя рабкораў і чытачоў газэты ўносіць 22 руб.

Выклікаем рэдкалегіі насьценгазэт заводаў «Працы» і «Зьвязда» (Мазыр).

Навіны навукі і тэхнікі

ДВАЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ КАДРАЎ У СЕКУНДУ

Малады японскі вучоны Сіба вынайшаў кіно-апарат, які здымае дваццаць тысяч кадраў у сэкунду. Да гэтага часу звычайны кіно-апарат дае 16 здымкаў у сэкунду, апарат для паскораных здымкаў, так зв. «лупа часу», дае каля 500 здымкаў. Дэманстраваньне фільмы, засьнятай апаратам Сіба на працягу 10 сэкунд, займае 3 гадзіны. Новы апарат прызначан для вывучэньня некаторых працэсаў, што шпарка адбываюцца, напрыклад, выбухі ў рухавіках унутранога згараньня, пашырэньне выбуху, палёту снарадаў і г. д. Вялізнае значэньне новы апарат мае для тэорыі лётніцтва. Здымкі птушак у часе іх лёту далі магчымасьць ужо зрабіць рад вельмі каштоўных аэрадынамічных вывадаў. Апарат Сіба ня толькі ловіць усе рухі лётнай птушкі, але і здымае паветраныя патокі і хвалі, што стварэюцца ў часе лёту.

«ПЛЫВУЧЫЯ АЭРАДРОМЫ»

Праблема рэгулярных трансатлянтычных паветраных зносін, як відаць, становіцца ў парадак дня. Усяго год ці два назад, вырашэньне гэтай праблемы бачылі ў пабудове звышмагутных самалётаў з вялікім радыусам чыннасьці або гігантскіх дырыжабляў тыпу нямецкага цэпэліну «ЛЦ127». Цяпер думка інжынэраў ідзе па другім шляху, па шляху пабудовы «плывучых аэрадромаў», плывучых будынкаў з пляцоўкамі для ўзьлёту і спуску самалётаў, з запасамі гаручага і г. д. Такія пабудовы мяркуецца спусьціць на ваду яшчэ ў жніўні бягучага году. Увосень-жа будзе арганізавана некалькі спробных пералётаў праз акіян пры дапамозе «плывучых аэрадромаў». У будучым годзе амэрыканскія фірмы думаюць наладзіць рэгулярныя трансатлянтычныя паветраныя зносіны.

Вялізных запасаў гаручага, якія поўнасьцю патлынаюць іх грузапад'ёмнасьць. Яны будуць папаўняць запасы гаручага на «плывучых аэрадромах». Тут-жа самалёты знойдуць схову ў часе шторму пры прымусовых пасадках. Як паведамляе амэрыканскі друк, рад амэрыканскіх фірм дзейна распрацоўвае ідэю пабудовы такіх «плывучых аэрадромаў». У работах быццам-бы прымае ўдзел такая салідная фірма, як «Джэнэраль Электрык Кампані». Першы «плывучы аэрадром» быццам-бы мяркуецца спусьціць на ваду яшчэ ў жніўні бягучага году. Увосень-жа будзе арганізавана некалькі спробных пералётаў праз акіян пры дапамозе «плывучых аэрадромаў». У будучым годзе амэрыканскія фірмы думаюць наладзіць рэгулярныя трансатлянтычныя паветраныя зносіны.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— РАЁННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ШЭФТАВАРЫСТВА КАСТРЫЧНІКАВАГА РАЁНУ адбудзецца 20 красавіка, а 6 гадз. увеч. у пам. антавай залі Камвузу (Універсытэцкая вул.). Пасяджэньне францыі там-жа а 5 гадз.

— У суботу, 20-IV, а 5 гадз. дня, у памяшканьні залі пасяджэньняў акрвыканкому адбудзецца пашыраны пленум Фрунзаўскага РК КП(б)Б сумесна з сэкрэтарамі яч. Парадак дня. 1. Аб рэгуляваньні і росьце партыі па раёне і садаклад РК ЛКСМБ. 2. Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету. 3. Аб вытворчасьці працы і проц. дысцыпліне і друкарні. 4. Арганізацыйныя пытаньні.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня агульны сход асьветнікаў гораду—даклад—«Чаму Троцкі скапіўся ў лягер буржуазіі» пач. а 7 з пал. г. ув. Заўтра дыспут «Быт асьветніка» уступае с. С. Вольфсона.

— У суботу, 20 красавіка, а 7 г. увечары ў залі пасяджэньняў ЦК (Дом Працы, 2-гі паверх) адбудзе пленум менскага акруговага камітэта таварыства па барацьбе з алкагалізмам. Павінны зьявіцца ўсе члены, кандыдаты, члены рэвізійнай камісіі і члены статыстычнай, мэдычнай і арганізацыйна-прапагандыцкай камісій.

Запрашаюцца бюро ячэек па барацьбе з алкагалізмам, прадстаўнікі рэдакцый менскіх газэт, прадстаўнікі [illegible] і НКЮ і навуковага таварыства [illegible] тароў. Парадак дня. 1. Абмеркаваньне праекту закону ўраду аб мерах барацьбы з алкагалізмам. 2. Аб удзеле антыалкагольных ячэек у падрыхтоўцы першамайскага сьвята і ў антыяліквідацыйнай кампаніі.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР, КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Пятніца, 19 красавіка — Для саюзу транспартнікаў — МОСТ — Пачатак а 8 гадз. увеч.

Кіно-тэатр КультурА — Навінка сэзону 1929 г. вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО — Песьня вясны — сучасная бытавая кіно-драма ў 6 част. па аповесьці народн. паэты БССР Якуба Коласа.

Ад аўторка, 16 красавіка мастацкі фільм — ЯЕ ШЛЯХ — сцэнары на апавяданьні М. Шкіціна (Сібіракага) „МАРЫНА".

КІНО Пятніцы Л — Гарольд Лёйд у бліскучай камэдыі — МАРАК — Зьвыш праграмы кіно-хроніка № 11—190

КІНО Пралетары — Стэнлей у глыбі Афрыкі — 1-ая серыя ў 8 частках — Пачатак сэансаў у 3, 4 і 5 г. Каса ад 2-х г. Цана білету 10 к. Месцы нумараваныя

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Юны піянэр (памяшканьне кіно „Пралетары") — Амэрыканскі трука-прыгодніцкі фільм — Авантурысты Джымі Блек

КІНО СпартаК

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЎРАЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА — Ленінск., побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66 — АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутран., хірургічн., жаночыя, зубныя, хваробы вока, нэрвоў, хваробы вуха, горла і носа і хваробы скуры.

ФІЗІЯТРЫЧНЫ ГАБІНЭТ кварц, электра і сьвета лячэньне

РЭНТГЕНАЎСКІ ГАБІНЭТ робіць здымкі, прасьвечваньне і лячэньне хворых. Прыём хэмікабактэрыялёгічных аналізаў.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ

Прымаюць па папярэднім запісе

На хвар. вуха, горла і носа—праф. Бурак па пятніцах ад 3-х гадз.
На вочных — —праф. Выдрын па чацьвяргох ад 6 гадз.
На унутраных — —праф. Гаўман па сярадах ад 5 з пал. гадз.
На нэрвовых — —праф. Кроль па чацьвяргох ад 6 гадз.
На хваробы вока — —праф. Камінскі па панядзелках і чацьвяргох ад 3—4 гадз.
На унутраных — —праф. Мелніх па чацьвяргох ад 5 з пал. г.
На хірургічных — —праф. Рубашоў па пятніцах ад 4 гадз.
На хірургічных — —праф. Саналовуні па аўторках ад 5—6 гадз.
На кішэчна-страўн. — —ляцэнт Монасзон па аўторках ад 8 гадз.
На хваробах скуры — —д-р Розэнталь па суботах ад 12 да 1 з пал. гадз. і па сярадах ад 8 г. увеч.
На дзіцячых хвар. — —д-р Гурэвіч па суботах ад 10 да 12 гадз.
На хваробах зубоў і поласьці роту—ляцэнт Старобінскі па пятніцах ад 6—7 г. увеч.

Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства. — Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

КАЖДОМУ советскому, торговому, кооперативному работнику необходимо быть подписчиком БУХГАЛТЕРСКИХ КУРСОВ НА ДОМУ

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ

продолжительность курсов 8 месяцев. Прием производится круглый год. На курсы принимаются лица обоего пола с 16 лет с образованием 4 группы семилетки

По окончании курсов выдаются установленные СВИДЕТЕЛЬСТВА

Плата за первый месяц 5 р., а остальные по 4 р. в месяц, переводится в начале каждого месяца по адресу: Минск, Всекобанк, текущий счет № 682, а подробные условия высылаются за две десяти копеечные марки

С запросами обращ.: Минск, Всекобанк, ЗАОЧНЫМ КУРСАМ

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Вайсковая кніжка Арабіна М. С., выд. Спускім ваенкаматам. 1501

Пашпарт Фішкіна Г., выд. менскай міліцыяй 1502

Пасьведчаньне Маршака І. Н., выд. Новасібірскім АДПУ ад 10-IV—г. г. 1503

Асабовая кніжка, выд. менск. ваенкаматам, пашпарт менакрміліцыі Воранова В. М. 1504-1505

Чл. біл. № 969 Цырлін Ш. Г., выд. саюзам будаўнікоў 1506

Пашпарт Шабуневіча П. К., выд. менскай міліцыяй 1507

Кніжка на атрыманьне хлеба, выд. к-рай адзелу эксплёатацыі МБВ ч. на імя Пратаповай М. 1508

Асаб. кніжка Дудкова І. Ф., выд. 40 канвоем 1509

Біржавы талён Вільдар Х. А., выд. менскай біржай працы 1510

Кавпар. кніжка Зірновай М. Е., выд. МЦРК 1511

Справка на атрыманьне хлебнай кніжкі МЦРК, выд. 4-м. адзд. менскай міліцыі Мунвез З. Н. 1512

Пашпарт Страшынскай Е. С., выд. менскай міліцыяй 1513

ГОТОВЬТЕСЬ К ПРАЗДНОВАНИЮ 1-го МАЯ

Постановление ЦК КП(б)Б о праздновании 1-го мая

1. Широкая популяризация деятельности Коминтерна в связи с десятилетием его существования и последним (VI) конгрессом

Агол Ш.—Коминтерн и колониальный мир . . . 12
Бухарин—Итоги VI конгресса Коммунистического Интернационала . 15
« —Программный вопрос на VI конгрессе Коммунистического Интерн. 25
« —Международное положение и задачи Коминтерна . . 35
Васильев—Работа и решения VI конгресса Коммунистического Интерн. 15
Гransберг и Анбор—Колониальный мир. Справочник для пропагандиста 1—00
Кабакчиев—Как возник и развился Коминтерн . . . 45
Комор—10 лет Коминтерна . . . 15
Коминтерн. Хозяйство, политика и рабочее движение в капиталистических странах в 1924-1927 г. . . 8—00
Коммунистический Интернационал о ВКП(б) . 06
Коммунистический Интернационал перед шестым Всемирным Конгрессом 4—00
Мануильский—Классы, государство, партия в период пролетарск. диктатуры 15
Партии Коммунистического Интернационала. Справ. пропаганд. . 1—00
Пятый Всемирный Конгресс Коммун. Интерн. 17 июня—8 июля 1924 г. I. 50
ч. II 30
Программа и устав Коммунистического Интернационала . 15
Расширенный пленум исполкома Коммунист. Интерн. 12-13 июня 1923 г. 60
Третий всемирный конгресс Коммунистического Интернационала . 50
Фишер. Курт—Коммунистическая партия Германии . 15
Четвертый всемирный конгресс Коммун. Интерн., 5 ноября—3 декабря 22 г. 50
VI конгресс Коминтерна. Стенографический отчет вып. I.
Международное положение и задачи Коминтерна
Против империалистических войн вып. II
Тезисы, резолюции и постановления вып. VI
VI конгреса Коммунистического Интернационалаа
Тивель и Хеймо—10 лет Коминтерна в решениях . 1—63

2. Освещение роли В. И. Ленина, как организатора и вождя Коминтерна

Ленин—Империалистическая война и раскол социализма . 35
« —Крах II интернационала . 50
« Социализм и война . 25
« Коммунистический Интернационал . 50
Ленин и Зиновьев—За III Интернационал . 2—20
Ленин—Собрание сочинений т. XVI . 1—75
« « « т. XVII . 1—50
« « « т. XVIII ч. I . 1—50
ч. II . 1—25

3. Раз'яснение роста военной опасности и необходимость усиления обороноспособности СССР

Вишнев—Экономическая подготовка Франции к будущей войне . 1—50
ВКП(б) и военное дело в резолюциях с'ездов и конференций ВКП(б) 1—60
Душан—Капиталистические государства . 1—10
Зарзар—Крепи оборону СССР . 06
Зорин—Опасность новой войны и наши задачи . 50
Коммунистический интернационал в война . 75
Кашен—Замыслы французских империалистов против СССР . 03
Колесниковий—Угроза новых войн . 1—00
Лапинский—Пакт Келлога и пакт против Келлога . 60
Майзель—Средиземно-морская проблема и опасность войны . 1—00
Пакт Келлога
Против войны. Вопрос о войне на VIII пленуме . 20
Рейман—Грядущая война и германская химическая промышленность 35
Стенографическ. отчет VI конгресса коминтерна (против империал. войны) 90
Современная война и ее средства . 10
Уншлихт—На основе Ленинского единства укрепим боевую мощь кр. армии 30
Шигалин—Подготовка промышленности к войне . 1—30
Яворский—Мир или война . 65
» —Лига наций и подготовка новых войн . 45

4. Раз'яснение сути трудности реконструктивного периода

Быстрянский—К характеристике правого уклона . 20
Бронский—Проблемы экономической политики СССР . 75
Вайсберг—План и хозяйствен. затруднения . 30
Гайстер—Дешевле производи . 10
Капалкин—Как строится фундамент социализма . 30
Ковалевский—Проблема планового регулирования народн. хозяйства 15
Ленин—О строительстве соц. хозяйства . 40
Леонтьев—Соц. строительство и его критики . 90
Молотов—О работе в деревне . 20
» К итогам ноябрьского пленума . 08
Молотов—Об успехах и трудностях соц. строительства . 10
» О вербовке рабочих и регулировании роста партии 12
Наше хозяйственное положение . 50
Поспелов и Шлихтер—Грудности соц. строительства и правый уклон 55
Рыков—Индустриализация и хлеб . 10
Рабоконь и Серебреников—За качество рядов партии . 20
Социалистическое строительство, самокритика и задачи печати . 80
Сегаль—Индустриализация окраин . 30
Резервы в народном хозяйстве ред. Гольцмана . 1—00

5. Необходимость решительного наступления на частно-капиталистические элементы

Арский—Как бороться с частным капиталом . 20
Кондурушкин—Частный капитал перед советским судом . 2—00
Ларин—Частный капитал с СССР . 2—50
Минчугин—Пути развития частного капитала . 1—25
Роденков—Комсомол в поход за урожай . 15

6. Борьба за поднятие производства, производственной дисциплины, реконструкцию и интенсификацию сельского хозяйства в связи с весенней посевной кампанией

Азизян—Для чего нужна крестьянину индустр. страны . 18
Брейтман—О выдвижении рабочих в госаппарат . 30
Брике—С. Х. и продовольственное положение . 15
Власов—Кооперативный план Ленина . 45
Евдокимов—Комсомол на страже колхозов . 20
Кондеев—Как поднять урожайность . 15
Кржижановский—Социалистич. реконструкция и культурн. строительство 15
К весенней посевной кампании . 45
К вопросу о соц. переустр. сельск. хоз. . 2—00
Лацис—Что должен знать рабочий о посевной кампании . 08
Лежнев-Фиськовский—Весенняя посевная кампания . 15
Революция ноябрьского пленума . 12
Сталин—На хлебном фронте . 05
Тирзанбурт—За трудовую дисциплину . 35
Ужанский—Урожай и народное хозяйство . 50
Чесунов—Советские зерновые фабрики . 12
Черномордин—За трудовую культуру . 12
Яновлев—Борьба за урожай . 35
» За колхозы . 40

7. Борьба с антисемитизмом и проявлениями шовинизма, усиление интернационального воспитания трудящихся

Александров—Классовый враг в маске . 15
Горев—Против антисемитов . 15
Попов—Национальная политика Сов. власти . 60
» Октябрьская революция и национальный вопрос . 25
Сандомирский—Пути антисемитизма в России . 25
Семашко—Кто и почему травит евреев . 10

ЗАКАЗЫ НАПРАВЛЯТЬ: в Белорусское Отделение Госиздата РСФСР—Минск, Советская, 41 и во все его отделения в округах

Менск. Галоўлітбел № 698. Друкарня газэты «Зьвязда». Менск